Па беларускай зямлі нібыта коціцца вайна. За мінулыя выхадныя ў аўтааварыях загінулі 27 чалавек і больш за 80 пакалечана

№№143–144
(3480–3481)

20 верасня 2011 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

www.nv-online.info

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

**Вы яшчэ не падпісаліся на "Народную Волю" на IV квартал 2011 года?
У паштовых аддзяленнях Вас чакаюць да 27 верасня, у спецыялізаваных пунктах "Белсаюздрук" (Мінск) — да 24 верасня.
Не спазніцеся!**

АКТУАЛІЯ

Светлана КАЛИНКИНА

Что взорвалось в минском метро?

13 апреля 2011 года. После теракта в минском метро прошли сутки. Председатель КГБ проводит брифинг и информационные агентства выдают новость (цитирую по государственному агентству БЕЛТА):

"Для взрыва в минском метро была использована не имеющая аналогов в мире взрывчатка. Об этом сообщил сегодня журналистам председатель Комитета государственной безопасности Беларуси Вадим Зайцев.

Отвечая на вопрос о том, из чего было изготовлено взрывное устройство, председатель КГБ сказал, что в нем использовалось особое взрывчатое вещество. Это вещество применялось и в Минске в июле 2008 года. По словам Вадима Зайцева, оно представляет интерес для экспертов иностранных спецслужб, так как аналогов такого вещества не существует почти нигде в мире. При взрыве в минском метро использовалась конфигурация этого уникального взрывчатого вещества. По словам председателя КГБ, достаточно нескольких граммов, чтобы при изготовлении бомбы человеку оторвало кисти рук. Для сравнения: во время теракта в Минске в День независимости общая масса взрывчатого вещества составляла почти 1 кг. По версии следствия, исполнитель теракта получил взрывчатку благодаря Интернету".

Признаюсь, меня сразу заинтриговала фраза, что для взрыва в минском метро была использована не имеющая аналогов в мире взрывчатка. Ведь история создания взрывчатых веществ удивительна. Порох действительно еще в начале нашей эры изобрели китайцы, но только потому, что у них селитра просто из земли выделяется и, смешиваясь с углем, как говорится, сама собой проявляет эффект. Не хочешь — заметишь. А вот дальше история создания взрывчатых веществ — это имена, академики и лауреаты. Сначала — известнейшие алхимики-монахи Марк Грек, Альберт Магнус, Роджер Бекон, Бертольд Шварц и другие. Потом — Ломоносов, Лавуазье, Бертло, Нобель, Абель и Дюар, Дмитрий Иванович Менделеев...

Второй момент: история создания взрывчатки это, по сути, история смертей. И самих изобретателей, и жертв их большого ума. У того же Альфреда Нобеля при взрыве в лаборатории погиб младший брат. И чтобы кто-то в кустарных условиях попытался нахимичить новую взрывчатку, и при этом даже не покалечился — это просто невероятное везение, настоящее чудо. Ведь над задачей сегодня работают даже не лаборатории — институты, но принципиально нового придумать уже не могут. А тут всех обошли два витебских пэтэушника!

Это же само по себе сенсация! И на самом деле сенсация мирового масштаба!

Одновременно это и позор! Потому что если бы таких юных вундеркиндов-самоучек заметили еще в школе, то Беларусь, не исключено, уже имела бы своих нобелевских лауреатов в области химии.

Но если хорошо вчитаться в слова Зайцева — то это еще и ужас. Ведь, по его признанию, парнями должны были заинтересоваться иностранные спецслужбы, поскольку "аналогов взрывчатого вещества нет ПОЧТИ нигде в мире". Почти — то есть где-то оно все-таки замечено, где-то применялось. Мировой терроризм в белорусской глубинке?..

На все вопросы, конечно же, должен был ответить суд.

И вот суд начался, обвинительное заключение зачитано.

Однако теперь получается, что руководитель белорусского КГБ со своим заявлением "не имеет аналогов", мягко говоря, сильно лоханулся. Выходит, что наши лучшие эксперты-взрывотехники, работавшие по этому делу, — не то что не лучшие, они вообще не профессионалы, они ослы. Можно даже сказать, что опозорились перед всем мировым профессиональным сообществом.

Цитирую по "Интерфаксу": *"Первое самодельное устройство Коновалов привел в действие на пересечении пр. Победителей и пр. Машерова в Минске. Его мощность составляла 655 г в тротиловом эквиваленте. Взрывчатка состояла из плавленого тротила и триацетон пероксида. Во взрывном устройстве использовался электрический детонатор, собранный из электрической лампы накаливания, будильника и двух элементов питания. Взрыва не произошло по техническим причинам, уточнил прокурор. Тогда обвиняемый привел в действие второе взрывное устройство аналогичного типа, упакованное в пачку из-под сока "Моя семья". Как передает корреспондент агентства, взрыв в метро Д.Коновалов готовил с июля 2010 года. Взрывчатое вещество смешанного типа, весом 12,5 кг, было изготовлено на основе аммиачной селитры, уротропина, алюминиевой пудры и триацетон пероксида. Взрыватель в самодельной бомбе был электрического типа, а само устройство — осколочно-фугасного действия".*

Кое-что вроде со словами Зайцева сходится. Во взрывах на День Независимости и в метро применялось одно и то же взрывчатое вещество — триацетон пероксида. И про него действительно можно много прочитать в интернете. Но, товарищи, это же хорошо известная "киса" (от переКИСЬ ацетона) — наверное, самое распространенное вещество в подпольной пиротехнике. Умельцы для всяких петард и хлопушек выпаривают эти кристаллы уже десятки лет из таблеток гидроперида (дамы ими когда-то осветляли волосы), ацетона и еще какой-то беды. И аналог ему, что хорошо известно специалистам, появился более ста лет назад в лаборатории немецкого химика Ричарда Вольфенштейна.

Как же так подставился председатель КГБ? Что это у нас за лучшие эксперты-взрывотехники, которые элементарную "кису" не сразу распознали?

Вопрос серьезный. Потому что врач должен безошибочно отличать кровь от компота, повар — соль от соды, а руководитель белорусской спецслужбы не имеет права отрывать от важных дел зарубежных коллег, звать на помощь серьезных специалистов со всего мира, если у него под носом оболтусы рванули "кису", выпаренную в домашних условиях. А ведь помощь извне мы просили дважды — и в 2008-м, и в 2011 году. Три года не могли понять, что взорвалось в пакете из-под сока в 2008-м, на День Независимости? Не хватило знаний идентифицировать вещество из невзорвавшейся коробки?

Я ситуацию понимаю так: это просто пощечина всей армии белорусских химиков, взрывотехников, правоохранителей. И теперь либо кто-то должен снять погоны за профнепригодность, либо все-таки честно ответить на вопрос: что на самом деле взорвалось в минском метро, и как могли витебские слесари это "не имеющее аналогов" достать?

Балючая, горкая вестка: не стала Галіны Сямдзянавай. Мужная, прыгожая дачка Беларусі была ў кагорце нязломных змагароў за незалежнасць Бацькаўшчыны ў гістарычны час напрыканцы 80-х — пачатку 90-х гадоў. Паглядзіце на здымак: менавіта яна ўнесла ў Авальную залу Вярхоўнага Савета 12-га склікання наш гістарычны бел-чырвона-белы сцяг, які стаў тады дзяржаўным.

Памяці Галіны Георгіеўны прысвячае слова адзін з яе паплечнікаў у тагачасным Вярхоўным Савеце Беларусі, грамадскі і палітычны дзеяч Сяргей Навумчык (стар.2).

Развітанне адбудзецца сёння, 20 верасня, у Зале рытуальных паслуг на вуліцы Альшэўскага, 12 з 13 да 15 гадзін. Галіну Сямдзянаву пахаваюць на Паўночных могілках Мінска.



Сярэдні заробак беларусаў — 182 долары

Сярэдняя стыпендыя — каля 22, а прэзідэнцкая стыпендыя — 35 долараў.

Па курсе 8600 рублёў за долар сярэдні заробак у Беларусі за першае паўгоддзе складае 182 долары (1.564.500 рублёў па звестках Белстата). Сярэдняя пенсія ў рублях за гэты ж перыяд — 600.400 рублёў, што складае 70 долараў па "новым курсе".

Мінімальная стыпендыя ў Белдзяржуніверсітэце складае 193.284 рублі, а гэта 22,5 долара, прэзідэнцкая стыпендыя цяпер 300.900 рублёў — 35 долараў, перадае "Еўрарадыё".

Нагадаем, што ў пераліку на долары сярэдні заробак у 2004 годзе складаў 160 долараў, а ў 2005-м — 215 долараў па курсе Нацбанка.

Як паспець за цэнамі?

У Мінску нехарчовыя тавары за жнівень падаражэлі на 15% Пра гэта паведаміла Галоўнае статыстычнае ўпраўленне Мінска. ***Найбольш падаражэў жаночы абутак — больш як на 50%,*** мужчынскі абутак — на 40%. Значна выраслі кошты на вопратку. ***Верхняя вопратка падаражэла амаль на 30%,*** бялізна — на 20%. Найменш падаражанне закранула пральныя парашкі — 2%, адзначае БелаПАН.

У рэдакцыю газеты «Народная Воля»

Шчыра дзякую ўсім, хто раздзяліў радасць у сувязі з маім 75-годдзем. Пастараюся і надалей быць патрэбным Бацькаўшчыне.

Генадзь БУРАЎКІН.

СУД

«Я спужаўся расстрэлу...»

Выбухі на Дзень Незалежнасці ў 2008 годзе і сёлета ў сталічным метро не мелі пад сабой рэлігійных ці палітычных падстаў. Гэтая выснова ўжо прагучала на судзе. Але пакуль так і не зразумела, што стала прычынай дзікунскіх здарэнняў, у якіх загінулі і былі пакалечаны дзясяткі людзей.

Вярхоўны суд Беларусі працягвае разгляд крымінальнай справы ў дачыненні да Уладзіслава Кавалёва і Дзмітрыя Канавалава, якія абвінавачваюцца ў шэрагу цяжкіх злачынстваў, у тым ліку ў выбуху на Дзень Незалежнасці ў Мінску і выбуху ў сталічным метро 11 красавіка бягучага года. У судзе распачалося даследаванне доказаў па гэтай крымінальнай справе. Па ініцыятыве дзяржабвінаваўцы — намесніка Генеральнага пракурора Беларусі Аляксея Стука, даследаванне доказаў разбіта на эпізоды.

Першым сталі разбіраць адзін з самых галоўных эпізодаў — выбух на станцыі метро "Кастрычніцкая".

Прыкладна тры гадзіны цягнуўся допыт Уладзіслава Кавалёва, які, на думку следства, непасрэдна ў злачынстве не ўдзельнічаў, але ведаў пра яго падрыхтоўку і не данёс. Кавалёў адразу адмовіўся ад сваіх паказанняў. Ён заявіў, што на папярэднім следстве на яго ціснулі псіхалагічна, падказвалі патрэбныя сведчанні: маўляў, загадалі прызнацца, паабяцалі, што тэрмін за неданясенне аб злачынстве будзе меншым, а па абвінавачанні ў тэрарызме — у лепшым выпадку 25 гадоў зняволення. Пры гэтым Уладзіслаў Кавалёў сказаў суду, што фізічнага ўздзеяння да яго не прымянялі. Прыгадаў толькі адзін выпадак, калі яго быццам бы моцна штурхнуў следчы, жонка якога часта бывае на "Кастрычніцкай".

На пытанне суда, чаму ж Кавалёў адмовіўся ад ранейшых паказанняў, ён адказаў проста: "Я спужаўся расстрэлу..."

Па версіі Кавалёва, якая была агучана ім у судзе, напярэдадні выбуху ў метро падзеі разгортваліся наступным чынам: ягоны сябар (цяпер — галоўны абвінавачаны ў тэракце) Дзмітрый Канавалаў прыехаў у Мінск цягнікам з Віцебска 10 красавіка бягучага года. Іх сустрэча адбылася на вакзале. Кавалёў заўважыў сумку, з якой прыехаў Канавалаў, аднак ні пра мэту візіту ў Мінск, ні пра тое, што знаходзіцца ў сумцы, быццам бы не ведаў. Адразу пасля прыезду Канавалава ў Мінск хлопцы паехалі на станцыю метро "Фрунзенская". У тым раёне знаходзіцца агенцтва нерухомасці, праз якое яны і знялі для Канавалава кватэру. Уладзіслаў Кавалёў падкрэсліваў, што ні разу не зазірнуў у сумку, якую прывёз з сабой Дзмітрый Канавалаў. І гэта, шчыра кажучы, не дзіўна. Бо калі да вас прыязджае сябар, вы кідаецеся нешта шукаць у ягонай сумцы альбо цікавіцеся, што ў ей? Пагадзіцеся, хутчэй нетыповымі паводзінамі можна прызнаць цікаўнасць да сумкі іншага чалавека.

Але гэта так — развагі на палях. Хто яго ведае, якія сапраўды былі адносіны паміж сябрамі Канавалавым і Кавалёвым, якія зараз адзін з адным не размаўляюць і нават у клетцы сядзяць разгароджаныя...

У дзень выбуху Кавалёў і Канавалаў сустрэліся на з'ёмнай кватэры. Пілі гарэлку. Бліжэй да вечара Канавалаў некуды з'ехаў... Сам Уладзіслаў застаўся дома. Вярнуўся Канавалаў праз некаторы час і пайшоў спаць. Пра выбух Кавалёў даведаўся праз тэлерэпартажы, але будзіць сябра не стаў. На судзе Уладзіслаў Кавалёў заявіў, што "не верыць у тое, што гэта мог зрабіць Канавалаў".

Бок дзяржабвінавачання адразу ж звярнуў увагу суда на супярэчнасці паміж паказаннямі, якія даў Кавалёў у судзе, і тымі, што былі падчас папярэдняга следства. Бо з паказанняў падчас следства, наадварот, вынікае, што ўсё ведаў, пра ўсё знаў.

Учора ў зале суда дэманстравалі відэазапіс першага допыту Уладзіслава Кавалёва. З яго вынікае наступная карціна. Пра тое, што ў сталічнай падземцы адбудзецца выбух, Кавалёў даведаўся ад Канавалава 10 красавіка на чыгуначным вакзале сталіцы, дзе і сустрэліся сябры. Больш за тое, Кавалёў на допыце сцвярджаў, што зазірнуў у сумку Канавалава і ўбачыў там дзве шклянкі, напоўненыя нейкім рэчывам. Адказваючы на пытанне следчага аб матыве, які рухаў Канавалавым, хлопец гаворыць: "Напэўна, яму хацелася вострых адчуванняў..." Пры гэтым ён адмовіў, што выбухі мелі рэлігійную ці палітычную падставу. Па словах Уладзіслава Кавалёва, Дзмітрый Канавалаў ні рэлігіяй, ні палітыкай не захапляўся.

Больш за тое, на следстве (і гэта засведчыў відэазапіс) Уладзіслаў Кавалёў паведаміў, што пасля здзяйснення выбуху ў метро Дзмітрый Канавалаў збіраўся звесці рахункі з жыццём. Быццам бы Канавалаў нават паказваў яму нейкія капсулы, якімі збіраўся атруціцца. Матывам для самагубства Канавалаў нібыта назваў тое, што 9 красавіка, знаходзячыся ў Віцебску, ён здаў адбіткі пальцаў і ведаў, што яго затрымаюць, бо на выбуховым прыстасаванні, якое не спрацавала на Дзень Незалежнасці ў Мінску, "пальчыкі" засталіся...

З відэазапісу вынікае, што калі Кавалёў супаставіў факты, то "сумненняў у тым, што выбух у метро зрабіў Канавалаў, не было..." На пытанне следчага, чаму Кавалёў не паведаміў аб плануемым злачынстве, ён адказаў, "што не прыняў намеры Канавалава ўсур'ёз..."

Якія паказанні ўсур'ёз успрыме суд — тыя, што былі на следстве, ці тыя, што агучаны ў судзе, — невядома. Але ад гэтага можа залежыць лёс абодвух хлопцаў. Бо два злачынцы — гэта ўжо група, гэта і дамоўленасць, і намер. І тэрміны зняволення для групы значна большыя, чым для адзіночкі.

Судовыя слуханні працягваюцца. Чакаецца, што на адным з бліжэйшых судовых пасяджэнняў распачнецца допыт галоўнага абвінавачанага — Дзмітрыя Канавалава.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ЭШЕЛОНЫ ВЛАСТИ

Академик Рубинов денег не считает...

Председатель Совета Республики академик Анатолий Рубинов не в курсе, сколько получает за свою "сенаторскую работу", а также индексировалась ли его зарплата.

"За своей зарплатой не слежу, я вам честно скажу, — заявил Рубинов журналисту "Еврорадио" **Дмитрию Лукашуку**. — *Потому как некогда. У нас разделение труда: я получаю — жена тратит. Поэтому я не очень... Мы иногда шутим на этот счет, когда едем возле автозаправки. Она говорит: "Вот вчера подорожало топливо". А я в ответ: "А мне какая разница — не я же плачу!". Женщины хозяйством занимаются, они это чувствуют, в магазинах знают — где, что и как. А если серьезно, о том, о чем вы спрашиваете, то я на самом деле не знаю (индексировались ли зарплаты сенаторов), нет у меня никакой информации, не могу вам ничего толкового сказать".*

Вот такая "академическая" правда жизни.

Подозреваю, что не только "сенатор" Рубинов так рассуждает, но и многие другие высокопоставленные чиновники. Во всяком случае нигде не было сообщений о том, что какой-то министр или депутат недоволен своей зарплатой, что кому-то из них после очередного подорожания на бензин не хватает. Не сильно страдают, видимо, и чиновничьи жены — на зарплату или депутатскую пенсию мужа можно, не задумываясь, покупать не только дорогущие по нынешним временам мясо и колбасы на рынке, но и небелорусскую косметику.

Когда мужчине жена не выносит мозг, что ей не хватает на новые сапоги или сумку, когда ему есть чем заплатить за ужин в ресторане, заправить авто, в общем-то, совсем не обязательно наизусть знать размер своей зарплаты. Значит, денег много. Но одно дело, когда обладатель этого самого кошелька занимается бизнесом, и совершенно другое — когда получает, как тот же Рубинов, строго фиксированную зарплату. Причем за счет налогоплательщиков.

Академику Рубинову и другим чиновникам все же иногда нужно отрывать свое бренное тело от теплых кресел и ходить в магазины. Хотя бы как в музей — на ценники посмотреть, народ послушать. Может, тогда чиновники, наконец, начнут интересоваться и чужой, и своей зарплатой. Сравнивать, подсчитывать, анализировать... В свое время, например, в магазин за кефиром ходили экспремьер **Владимир Ермошин** и покойный председатель Мингорисполкома **Михаил Павлов**. Без охраны. Ясное дело, люди узнавали их, оборачивались, те, кто посмелее — здоровались, заводили беседы, рассказывали о своих проблемах. И такое общение всем было только на пользу.

Генпрокурор **Григорий Василевич** стал устраивать чиновникам антикоррупционные экскурсии в СИЗО. Может, премьер-министру **Михаилу Мясниковичу** стоит строем вывести правительство и депутатов всех мастей хотя бы в продовольственные магазины — чтобы на прилавки посмотрели и себя, любимых, людям явили. Да послушали, что им скажут те, кто около витрин считает мелкие купюры. А то живут, как в сказке...

Марина КОКТЫШ.

РЕЗОНАНС

«Хоть бы думали, перед тем как отвечать, слуги народа!»

Чистосердечное признание академика, с которым любит советоваться А.Лукашенко, взорвало интернет.

"А я думал, это у него работа такая — знать, как цены растут, где какие проблемы, — вовсю обсуждали перлы академика на форуме популярного интернет-портала tut.by. — *Как же далек этот Рубинов от народа: цен на продукты питания не знает, стоимость бензина ему до лампочки — и такие у нас занимают высокие государственные должности... Хоть бы думали, перед тем как отвечать, слуги народа! На таких серьезных должностях и такие клоуны! Это ж сколько платят чЭсным депутатам и чиновникам, что они не грузятся балансом кредитки?! Ну и как могут такие люди, с заплывшей жиром совестью, войти в положение граждан? Какой им кризис, какой рост курса! У них коммунизм уже наступил. Одни "избранники народа" машины по 100 тысяч долларов покупают, другие даже не знают, сколько им платят, потому что весь народ на них горбатится...*

Народная Воля
http://www.nv-online.info
20 ВЕРАСНЯ 2011 г.

НЕЗАЛЕЖНАЯ ЭКСПЕРТЫЗА

Уладзімір КУЛАЖАНКА, доктар эканамічных навук, прафесар

Грошы ці фанцікі?

Сёння гаварыць аб тым, што ў Беларусі эканамічны крызіс пераадолены ці паспяхова пераадольваецца, — не выпадае. Валютны крызіс і крызіс фінансавы па-ранейшаму моцна праяўляюць сябе ў нашай эканоміцы. Так, дэвальвацыя беларускага рубля вясной бягучага года выклікала інфляцыю, крызіс крэдытных адносін, рэзкае зніжэнне рэальных даходаў насельніцтва. І хіба можна было чакаць іншага пры зніжэнні курса рубля ажно на 56 працэнтаў?

Да апошніх дзён непакоіла людзей і тое, што замежнай валюты не было ў абменніках. Доўгі час трымаўся чорны валютны рынак, дзе долар можна было купіць не па афіцыйным валютным курсе 5000 рублёў за долар, а за 7500—8500 рублёў. Усё гэта моцна ўдарыла па наймальніках кватэр, якія плацілі за наём па 200—300 долараў у месяц. Бо ніхто не думае зніжаць ім квартплату на 56 працэнтаў. У цяжкае становішча трапілі студэнты-першакурснікі, якія не змаглі атрымаць месца ў інтэрнаце і павінны здымаць кватэры...

Нізкі валютны курс рубля стымулюе інфляцыю і напампаванне эканомікі рублёвай масай. З пачатку года інфляцыя вырасла да 36,2 працэнтаў, і яе рост не спыняецца і сёння. Доўгі час беларускае начальства хвалілася сваёй мадэллю паспяховага развіцця. Зараз гэтая мадэль дала свае вынікі. Па росце інфляцыі Беларусь абагнала ўсе краіны СНД у разы. Некаторыя тавары падаражэлі ўдвая, а то і ўтрая.

Паколькі дэвальвацыя рубля разбуральна дзейнічае на эканоміку, то можна было чакаць, што ўрад пачне прымаць меры рэгулявання ўзніклай сітуацыі. Аднак апроч заяў і абяцанняў нічога станоўчага не рабілася. Яшчэ ў чэрвені было заяўлена, што свабодны валютны рынак зноў будзе адкрыты праз які месяц. Прайшло два месяцы, а валютай у абменніках і не пахла. Был заяўлена, што для гэтага валютны запас трэба падняць да 2,5—3,0 мільярдаў долараў. Але дзе ўзяць такую суму валюты? Ні Масква, ні МВФ не выручаюць. Можа, Катар дасць у пазыку? Але, як паказаў візіт А.Лукашэнкі ў гэтую краіну, катарскія лідары маюць клопат пра сваю краіну і гатовы размясціць свае капіталы так і туды, дзе можна атрымаць прыбытак. Фінансавы цэнтр будзе створаны ў Беларусі менавіта з гэтай мэтай. Ды ўсё гэта будзе створана, так бы мовіць, заўтра, а грошы нам патрэбны сёння.

Нейкая надзея на выратаванне ўзнікла ў маі, калі за папярэдні месяц экспарт тавараў і паслуг перавысіў імпарт на 150 мільёнаў долараў. Усе радаваліся. Быў рады і аўтар гэтых радкоў. Але ўжо ў чэрвені сітуацыя змянілася. Як у той прыказцы, "не доўга музыка іграла, не доўга фраер танцаваў". Дэфіцыт гандлёвага балансу дасягнуў 607 мільёнаў, а па выніках за паўгода перавысіў 4 мільярды долараў. Сумна, што гэты паказчык стаўся горшым за мінулагодні амаль на 1,5 мільярда долараў.

Са сказанага вынікае, што дэвальвацыя рубля ў Беларусі выкарыстоўваецца ў знешнім гандлі дрэнна. Ухапілі ў маі 150 мільёнаў долараў і супакоіліся. Між тым у свеце ідзе вострая барацьба за тое, каб з мэтай паляпшэння ўмоў знешняга гандлю канкурэнт павысіў валютны курс сваёй валюты. Менавіта такое патрабаванне маюць ЗША да юаня КНР. Аднак Кітай не рэагуе на гэта патрабаванне. І не рэагуе таму, што гэта для яго нявыгадна. У Японіі, каб панізіць курс іены, увесь час прымаюцца меры. Напрыклад, павышаецца штучны попыт на долар, каб знізіць кошт іены. Але моцная эканоміка не рэагуе на гэта.

На эканоміку Беларусі, на валютна-фінансавы крызіс уплывае стан сусветнай эканомікі. Пасля плацежнага крызісу ў ЗША адбыўся неадкладны спад каціровак на фондавых біржах ЗША, Англіі, Японіі, Кітая і Расіі. Затым, праз дзень, каціроўкі павысіліся. Але праз некаторы час такое ваганне адбылося зноў. Пасля гэтага назіраецца стабілізацыя і ўздым. Чаму? Таму што эканоміка ЗША з'яўляецца самай магутнай эканомікай свету. Долар як сусветную валюту з гэтай прычыны змяніць няма чым. Ішлі размовы, каб для стабілізацыі эканомікі свету замяніць долар на іншую валюту. Але якую краіну абраць? Кітай? Не падыходзіць з-за галоты. У гэтай краіне вытворчасць ВУП на чалавека адстае ад ЗША амаль у 7 разоў. Расійскі рубель таксама не падыходзіць — нізкі ўзровень развіцця. Так што прыйдзецца трымацца за долар. Гэтую акалічнасць трэба ўлічваць пры рэгуляванні.

Пільна трэба сачыць і за валютным курсам расійскага рубля. Гэта абумоўлена тым, што знешні гандаль Беларусі ў значнай меры вядзецца менавіта з Расіяй. А там апошнім часам таксама назіраецца дэвальвацыя. Яшчэ месяц таму валютны курс расійскага рубля быў роўны 27 рублям з капейкамі за адзін долар, зараз набліжаецца да 29 рублёў. Не ўлічваць гэта пры тавараабмене нельга.

Што датычыцца рэгулявання валютна-фінансавых адносін унутры краіны, то яны не адрозніваюцца арыгінальнасцю і дзейнасцю. Проста ідзе напампаванне эканомікі папяровымі грашыма.

Дзейнасць у галіне грашовай палітыкі з боку ўрада і Нацбанка настолькі супярэчлівая, што сэнс яе ўвогуле цяжка зразумець. Каб адрэгуляваць валютны курс рубля і зрабіць яго рыначным, трэба строга абмяжоўваць эмісію грошай. Іх колькасць можа быць павялічана пры росце прадукцыйнасці працы і вытворчасці ВУП. І то з улікам абароту грашовай адзінкі. А ў нас што робіцца? Грошы друкуюць і эмісіюць таму, што грошы патрэбны. За першае паўгоддзе бягучага года грашовая маса ў краіне вырасла на 5,7 трлн рублёў і дасягнула велізарнай сумы — 31,2 трыльёна, ці 3 мільёны 200 тысяч рублёў на чалавека. У другім паўгоддзі эмісія грошай не скарацілася, а ўзрасла. Толькі за ліпень 2011 г. яна склала 1,5 трыльёна рублёў. Прырост грашовай масы штодзённа складаў 50 мільярдаў рублёў!

У жніўні па росце цэн можна меркаваць, што эмісія грошай працягвалася. Афіцыйны валютны курс рубля пераваліў за 5000 рублёў за долар, а на "чорным" рынку курс рубля ў доларах перавысіў 8000 рублёў. Навідавок пачалі расці цэны. Напрыклад, на прадукты харчавання яны ўзняліся з пачатку года аж на 53,5 працэнта.

Між тым беларускі ўрад не прымае дзейсных захадаў па ўмацаванні беларускіх грошай. Даўно наспела замена нашых грошай на аснове дэнамінацыі. Што гэта за грошы, калі няма капеек? Ніхто не ведае, але ў нас ролю капейкі выконваюць 10-рублёвая ці 20-рублёвая купюры. Ролю ранейшага савецкага рубля ўзяла на сябе тысячная купюра. "Дробныя фанцікі", як назваў нашы купюры ў 10, 20, 50 рублёў вядомы эканаміст прафесар Б.Жаліба, ператвараюцца ў смецце. Трэба ўвесці новыя грошы і назваць іх па-беларуску — талер ці як інакш. Трэба паважаць сябе.

Куды ні глянь, праблема грашовай рэформы наспела. І трэба спяшацца, інакш Расія ўвядзе ў нас свой рубель і праглыне Беларусь цалкам, як нядаўна заўважыў былы кіраўнік урада Беларусі Вячаслаў Францавіч Кебіч.

Крызіс валютных адносін дапаўняецца крызісам фінансавым. Гэта добра відаць на прыкладзе крэдытных адносін. Летась стаўкі рэфінансавання хоць і скупа (па 0,5 працэнта), але перыядычна зніжаліся. А гэта азначала, што ўмовы выйсця з крызісу і развіцця эканомікі паляпшаліся. А зараз, калі на пачатку жніўня стаўку рэфінансавання паднялі да 20 працэнтаў, мяне гэта здзівіла і напалохала. А калі ў сярэдзіне жніўня стаўку рэфінансавання зноў павысілі, ужо да 22 працэнтаў, то выклікала вялікую трывогу. Пасля гэтага стаўкі крэдытавання ўзляцяць да 25—30 працэнтаў. Гэта моцны ўдар па прадпрымальніцкім сектары. Яшчэ нядаўна ўлады заяўлялі, што маюць намер дабіцца такога прадпрымальніцтва, што гэты сектар будзе вырабляць не 11 працэнтаў ВУП краіны, а ўсе 40, а можа, і болей, як у перадавых краінах. Зразумела, што пры сённяшніх умовах крэдытавання эканомікі дасягненне гэтай мэты нерэальна ў бліжэйшай перспектыве.

Высокія стаўкі працэнта па крэдытах пагаршаюць умовы жыцця індывідуальных заёмшчыкаў. Справа ў тым, што банкі, каб не прагарэць, мусяць павышаць плату за атрыманыя крэдыты, напрыклад, на будаўніцтва. Тут можа ўзнікнуць крызіс.

Звычайна павышэнне платы за крэдыт банкі тлумачаць неабходнасцю барацьбы з інфляцыяй. І гэта так. Але чаму адначасова расце эмісія грошай? Хто патлумачыць гэтую супярэчнасць?

Павышэнне стаўкі крэдыту пагаршае ўмовы валютных адносін. Якім чынам? Вельмі проста. Дэвальвацыя беларускага рубля стымулюе экспарт, што праявілася ў маі гэтага года. А на імпарт уплывае слаба. Пры гэтым трэба адзначыць важную акалічнасць. Справа ў тым, што ў нашай краіне праводзіцца палітыка росту і ўкаранення інавацый. Але наша прамысловасць працуе на пастаўляемых з іншых краін сыравіне і камплектуючых. У гэтых умовах без сур'ёзнага імпартазамяшчэння нельга дабіцца станоўчых паказчыкаў знешнегандлёвага балансу. Адпаведна немагчыма адрэгуляваць валютныя адносіны.

А каб быў танны крэдыт, то пры дзяржаўным рэгуляванні можна было б арганізаваць падключэнне прадпрымальнікаў адной группы на выраб адных камплектуючых ці матэрыялаў, другой групы — на выраб іншых рэсурсаў і г.д. А так сітуацыю, калі на асобных прадпрыемствах у вытворчасці выкарыстоўваецца толькі 10 працэнтаў уласных (рэспубліканскіх) рэсурсаў, цяжка пераадолець. Замест канкрэтнай справы будзем працягваць толькі гаварыць аб імпартазамяшчэнні. Вось да чаго можа прывесці падаражанне крэдытаў.

Агульная выснова такая, што валютна-фінансавы крызіс у Беларусі можа прывесці да другога этапу, пра які апошнім часам гавораць як у Еўропе, так і ў Амерыцы.

Кому должны:*

Россия — 9,7 млрд;
Международные организации (например, МВФ) — 3,9 млрд долларов;
Германия — 1,9 млрд;
Австрия — 1,6 млрд;
Латвия — 1,4 млрд;
Китай — 1,2 млрд;
Кипр — 894,3 млн
Швейцария — 744,1 млн;
Соединенное Королевство — 642,6 млн;
Словакия — 571,5 млн;
Нидерланды — 467,6 млн;
Украина — 362,6 млн;
Польша — 350,7 млн;
Иран — 343,7 млн;
США — 322,7 млн;
Литва — 256,1 млн;
Италия — 255,7 млн;
Франция — 122,8 млн;
Чехия — 117,4 млн;
Казахстан — 22,3 млн;
остальные страны — 6515,4 млн.

** в долларовом эквиваленте.*

В какой валюте будем отдавать (от общего объема обязательств):

47% — доллары;
27,9% — евро;
6,9% — российский рубль;
3,4% — белорусский рубль;
0,1% — японская йена;
14,7% — другие валюты.

По данным Нацбанка на 1 апреля 2011г.

"КП" (6.07.2011 г.)

Сколько долгов у них и у нас (из расчета на душу населения)?

Великобритания	147 тысяч долларов
Германия	63,5 тысячи долларов
Испания	52,6 тысячи долларов
США	46,5 тысячи долларов
Эстония	16,8 тысячи долларов
Литва	10,9 тысячи долларов
Казахстан	5,6 тысячи долларов
Польша	5,2 тысячи долларов
Беларусь	**3,5 тысячи долларов**
Китай	3,4 тысячи долларов
Украина	2,1 тысячи долларов

Данные на начало года.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Андрэй ШОРАЦ:

«Нідзе ў свеце няма столькі ўласнікаў кватэр, як у нас»

Два пытанні міністру жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі Андрэю Шорацу.

Карэспандэнт "Народнай Волі" датэлефанаваўся на "прамую лінію" з міністрам і задаў яму пару пытанняў.

— Андрэй Віктаравіч, адкажыце, што чакае маламаёмасных, а цяпер і зусім збяднелых пенсіянераў, якія не ў стане аплачваць камунальныя паслугі і квартплату? Ці будуць іх высяляць з кватэр, калі яны пры цяперашняй складанай эканамічнай сітуацыі не пацягнуць "камуналку"?

— Ведаеце, нідзе ў свеце няма столькі ўласнікаў кватэр, як у нас — 85,5 працэнта! На Захадзе абсалютная бальшыня людзей здымае жыллё за пэўную плату, а ў нас амаль усе ўласнікі. Тут сітуацыя ў кожным выпадку індывідуальная. Ніхто, канечне, без дай прычыны высяляць пенсіянераў не збіраецца. Варыянтаў, каб неяк справіцца з праблемай, досыць. Але, паўтараю, у кожным выпадку трэба падыходзіць індывідуальна. Як адзін з варыянтаў — продаж, скажам, трохпакаёўкі ці двух і набыццё больш таннай — аднапакаёвай кватэры. За кошт розніцы ў цане можна няблага жыць і не мець клопатаў з аплатай камунальных паслуг...

— Шматкватэрнаму дому, у якім я жыву, — дваццаць чатыры гады. Штомесячна мы робім адлічэнні на капітальны рамонт, які невядома калі будзе. Між тым грошы, пералічаныя на капрамонт, ператвараюцца — дзякуючы дэвальвацыям — у труху... І хто возьмецца рамантаваць дом, калі на рахунку "смешная сума"?..

— Па-першае, адлічэнні вы робіце не з моманту, калі засяліліся ў кватэру, а пачынаючы з 1999 года... Што тычыцца абясцэньвання грошай, звязанага з дэвальвацыямі, то тут варта шукаць выйсця самім уласнікам кватэр. Цяпер ствараюцца таварыствы ўласнікаў жылля, і ўжо самі гаспадары вырашаюць, у якім памеры, якім парадкам рабіць грашовыя адлічэнні на маючы адбыцца капітальны рамонт. Так паўсюль у свеце. Верагодна, і нам з вамі не мінуць такой практыкі. Проста трэба ініцыятыва з боку саміх грамадзян, іх практычныя дзеянні па стварэнні свайго таварыства ўласнікаў. Тут не варта чакаць, што нехта іншы прыйдзе ў ваш дом і вырашыць усе праблемы...

Георгій ЧЫГІР.

ПАЛІТКУХНЯ

Што скажа Мінюст?

Аргкамітэт па стварэнні партыі "Беларуская хрысціянская дэмакратыя" (БХД) пачаў падрыхтоўку да правядзення чацвёртага ўстаноўчага з`езда партыі, які плануецца правесці 17 снежня.

Як адзначыў сустаршыня аргкамітэта **Віталь Рымашэўскі**, рэгістрацыя БХД у якасці партыі абароніць актывістаў ад пераследу на падставе артыкула 193 Крымінальнага кодэкса Беларусі, які прадугледжвае адказнасць за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі.

Разам з тым кіраўніцтва БХД не мае ілюзій, што ўлады пойдуць на рэгістрацыю партыі і не будуць перашкаджаць дзейнасці сябраў аргкамітэта.

РЭЙТЫНГ

Ці дагонім Японію?

Беларусь палепшыла сваё становішча ў рэйтынгу краін паводле ўзроўню развіцця інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій (ІКТ).

Пра гэта сказана ў справаздачы "Вымярэнне інфармацыйнага грамадства: 2011 год", якую апублікаваў Міжнародны саюз электрасувязі.

Індэкс разлічаны па 11 паказчыках, якія адлюстроўваюць прагрэс у галіне ІКТ, у прыватнасці, доступ да інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, узровень развіцця гэтых тэхналогій, навыкі працы насельніцтва з імі ды іншае. У справаздачы адзначаецца, што па выніках апошніх двух гадоў паляпшэнняў у індэксе ІКТ дамагліся Азербайджан, Арменія, Беларусь, В(етнам, Грузія, Расія і шэраг іншых краін.

З 2008-га па 2010 год у рэйтынгу Беларусь перамясцілася з 58-й на 52-ю пазіцыю. Наперадзе яе Расія (47), Латвія (40), Польшча (38), Літва (35). З усіх суседзяў адстае ад Беларусі толькі Украіна (62). Найлепшае становішча ў Рэспубліцы Карэя, скандынаўскіх краінах, Кітаі і Японіі. Найгоршае — у афрыканскіх краінах.

РАЗВІТАННЕ

Успомніць пра яе і Беларусь

Радкі ў памяць Галіны Сямдзянавай я пішу ў дзень, калі адзначаецца 20-годдзе прыняцця бел-чырвона-белага сцяга і герба "Пагоня" ў якасці дзяржаўных сімвалаў. Дакладней — павінна было б адзначацца, калі б краіна была такой, як марыла пра яе Галіна і дзеля якой працавала.

У такой краіне ў гэты дзень яе імя было б на першым месцы — бо менавіта Сямдзянава ўнесла ў Авальную залу бел-чырвона-белы сцяг.

Відаць, мне трэба было б прыгадаць, якім чалавекам была Галіна, расказаць нейкія па-за палітычныя эпізоды, і так бы зрабіў — зноў жа, пры іншых абставінах, калі б кожны школьнік ці студэнт ведаў бы пра тых, хто здабыў краіне Незалежнасць. У Беларусі — інакш. Прозвішчы гэтых людзей выцерты з афіцыйнай гісторыі. Таму сёння скажу пра Галіну як пра палітыка і колішняга калегу па апазіцыі БНФ у Вярхоўным Савеце.

Паводзіны Галіны Сямдзянавай у Вярхоўным Савеце 12-га склікання можна назваць толькі адным словам — гераічныя.

Бачу яе ў дні красавіцкіх страйкаў 1991-га, калі яна ўвайшла ў залу, дзе ішло пасяджэнне Прэзідыума ВС, і перадала ўльтыматум аршанскіх рабочых: "Калі праз сем хвілін не будзе адказу, людзі лягуць на рэйкі". Рэплікі разлаваных дэпутатаў-камуністаў яна выслухала з усмешкай. Міністр унутраных спраў і старшыня КДБ не абмежаваўся рэплікамі; на Сямдзянаву прамовы генералаў не падзейнічалі.

Дні 24—25 жніўня 1991-га, калі надзвычайная сесія Вярхоўнага Савета абвясціла Незалежнасць, упісалі імя Галіны Сямдзянавай у беларускую гісторыю назаўсёды. Гэта менавіта Галіна Сямдзянава на просьбу Пазьняка ўнесла перад пачаткам сесіі ў прэзідыум Авальнай залы бел-чырвона-белы сцяг (нарэшце, знайшоўся здымак, і спадзяюся, што цяпер "версіі" легенды з удзелам дырэктара саўгаса ці касманаўта знікнуць).

А потым, калі на трыбуну пайшоў першы сакратар ЦК КПБ, Сямдзянава стала паміж ім і мікрафонам — і колішні ўладар рэспублікі быў вымушаны паплесціся на месца. Менавіта гэта псіхалагічна зламала пракамуністычную дэпутацкую большасць, і мы дамагліся Незалежнасці.

У пачатку верасня 1991-га Галіна Сямдзянава курыравала стварэнне "вайсковага блоку" законапраектаў, якія апазіцыя БНФ падрыхтавала на шостую нечарговую сесію — гэтых законапраектаў было 16. Калі тэксты перадаваліся ў сакратарыят ВС на раздрукоўку, нехта з дэпутатаў павінен быў завізаваць іх сваім подпісам, гэта была простая фармальнасць, але тое, што пад прапановамі на вераснёўскую, 1991 года сесію аб стварэнні ўласнага войска і аб прыняцці бел-чырвона-белага сцяга і герба "Пагоня" ў якасці дзяржаўных сімвалаў стаіць подпіс менавіта Галіны Сямдзянавай, сёння мне бачыцца сімвалічным.

11 красавіка 1995 года, калі мы, 19 дэпутатаў, якія з(яўляліся сябрамі БНФ, абвясцілі галадоўку супраць знявагі нацыянальных дзяржаўных сімвалаў і беларускай мовы, мы, добра ведаючы, які чалавек сядзіць ззаду нас за прэзідэнцкай трыбунай, і варыянт удзелу ў галадоўцы жанчыны, зразумела, быў выключаны. Але менавіта праз Галіну мы трымалі сувязь з даверанымі асобамі ў тую ноч.

Галіна Сямдзянава ўзначальвала Беларускую асацыяцыю вайскоўцаў "Вяртанне" і працавала ў Камісіі па экалогіі ВС Беларусі. Шкада, што ўратаваўшы больш за чатыры тысячы вайскоўцаў (а вяртанне іх у Беларусь з месцаў, якія былі "гарачымі кропкамі" ці патэнцыяльна маглі імі стаць, інакш як ратаваннем не назавеш), і невядома, колькі тысяч жыхароў Беларусі (дэпутатам тады ўдавалася дамагацца і перасялення з забруджаных Чарнобылем раёнаў, і выканання экалагічных нарматываў) — Галіна не ўратавалася сама ад хваробы, якая косіць усё больш людзей у Беларусі і зусім не старога веку.

Мы, яе калегі і сябры, будзем заўсёды помніць Галіну Сямдзянаву, а надыдзе час — успомніць пра яе і Беларусь.

Сяргей НАВУМЧЫК, дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 12-га склікання.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Лешак ШАРЭПКА:

«Расставім кропкі над «і»

Учора пасол Польшчы ў Беларусі Лешак ШАРЭПКА правёў для журналістаў "надзвычайную" прэс-канферэнцыю, якая датычылася прагучаўшых у мінулую нядзелю заяў на Першым нацыянальным тэлеканале.

— Мы не хацелі каментаваць сюжэт на Беларускім тэлебачанні, але справа датычыцца нацыянальных меншасцяў, а гэта вельмі далікатнае пытанне, — расказаў **Лешак ШАРЭПКА**. — У прыватнасці, было заяўлена, што польскі бок, маўляў, выганяе Беларускі культурны цэнтр з Беластока. Гэта не зусім так. Як вядома, існуе Польскі інстытут у Мінску і Беларускі культурны цэнтр у Польшчы. Было падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве ў вобласці культуры і навукі. У адпаведнасці з міжнароднай дыпламатычнай практыкай мы адкрылі свой інстытут менавіта ў сталіцы Беларусі. А вось беларускі бок адкрыў цэнтр у Беластоку. Мы на гэта згадзіліся, але з'явіліся праблемы, якія былі звязаны са статусам работнікаў гэтай установы. У нас прынята так, што калі дыпламатычны работнік працуе не ў сталіцы, то ў яго статус консульскай установы. А супрацоўнікі Беларускага культурнага цэнтра лічацца дыпработнікамі. Мы прапанавалі беларускаму боку, што трэба прывесці сітуацыю да агульнапрынятых стандартаў. Першыя кансультацыі прайшлі яшчэ ў кастрычніку мінулага года і працягнуліся ў маі гэтага. Мы падрыхтавалі праект пагаднення, і, наколькі вядома, з беларускім бокам ніякіх вялікіх рознагалоссяў няма. Усё, можна сказаць, узгоднена. Беларусь адкрывае свой культурны цэнтр у Варшаве, але гэта не перашкода, каб такія ж з'яўляліся і ў іншых месцах. Праўда, яны будуць мець статус консульскіх. Вось і ўся праблема! Дык хто і каго выганяе? Мы не разумеем, для чаго гэты факт быў выкарыстаны Беларускім тэлебачаннем.

— Вы будзеце патрабаваць ад Першага нацыянальнага тэлеканала абвяржэння?

— Не будзем, бо ў нас не вельмі добры вопыт з такімі запытамі. Лепш самі расставім кропкі над "і".

Алесь СІВЫ.

Літва отменила для некоторых белорусов консульский сбор за национальную визу

Правительство Литвы приняло постановление об отмене консульского сбора за национальную визу, который в настоящее время составляет 60 евро.

Консульский сбор не будет взиматься в случае оформления долгосрочных национальных виз категории D, которые выдаются лицам, намеревающимся пробыть в стране более трех месяцев за полгода. С такой визой, кстати, ограниченное время можно посещать и другие страны Шенгенского пространства.

Бесплатные визы будут также выдаваться студентам, спортсменам, журналистам, а также другим легально работающим лицам, однако не будут выдаваться тем, кому виза необходима в туристических или других краткосрочных целях.

Для этих целей требуется шенгенская виза, стоимость которой установлена ЕС в размере 60 евро.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
20 ВЕРАСНЯ 2011 г.

СУПРАЦЬ ПЛЫНІ

*Акцыя пратэсту 19 снежня 2010 года прэзентавала шмат новых прозвішчаў і імён.
У фокусе грамадскай увагі з'явілася нямала асоб, якія прадэманстравалі яскравыя прыклады патрыятызму, нязгаснай любові да Радзімы.
Гэта — людзі, а не прыстасаванцы. Людзі, а не трусы. Людзі, а не бязродныя істоты.
Адкрываючы ў газеце новую рубрыку "Супраць плыні", мы вырашылі расказаць менавіта пра такіх людзей. Першы нарыс — пра Фёдара Мірзаянава.*

Два Фёдары

Адразу ж хачу папярэдзіць тых, хто ўбачыў у маёй назве нейкі плагіят з першага фільма Марлена Хуцыева, і падкрэсліць, што такі выбар цалкам абгрунтаваны. Фёдара Мірзаянава прынцыпова назвалі ў гонар дзеда. Толькі той пасля вайны змагаўся ў Заходняй Беларусі за савецкую ўладу, а ўнук — супраць улады, існуючай зараз.

Прага свабоды

Фёдара-малодшага за адны і тыя ж падзеі арыштоўвалі двойчы. Першы — адразу ўвечар 19 снежня 2010 года. За гэта яму далі "традыцыйныя" 15 сутак арышту і накіравалі у Жодзінскі СІЗА. Другі раз "узялі" 25 студзеня 2011 года. І зрабілі гэта вельмі непрыгожа. Калі не сказаць больш жорстка — подла. Дачакаліся, пакуль застаўся апошні экзамен, і "закрылі". На жаль, сёння падобнае лічыцца "вышэйшым пілатажам".

І нікога не засмуціла, што "ўдзелу ў масавых беспарадках" не пацвердзіла нават міліцэйскае відэа. Тры гады турмы далі толькі за тое, што юнак смяяўся на прыступках Дома ўрада і выцягнуў з кімсьці пабітага шкла асколак, які мог параніць іншых. Англійскі пісьменнік Льюіс Кэрал называў такія краіны Залюстэркаўем...

Прадзеда Федара-малодшага па лініі маці звалі Іванам Георгіевічам. У гэта цяжка паверыць, але звычайны сялянскі чалавек пра гісторыю сваёй краіны ведаў не менш, чым пра ўласную гаспадарку. Ён не меў спецыяльнай адукацыі (чатыры класы пачатковай школы), але пра Кастуся Каліноўскага і Тадэвуша Касцюшку ўпершыню ўнучка Людміла пачула менавіта ад яго, бо на ўроках школьнай гісторыі іх прозвішчы тады не ўзгадвалі. І свайго сына ён хацеў назваць у гонар знакамітага барацьбіта за незалежнасць беларускай краіны, але жонка палічыла гэта больш не беларускім імем, а польскім. У выніку сямейнага кампрамісу, які стаў следствам лагічнага ланцуга Тадэвуш-Тодар-Фёдар, Людміла і стала Фёдараўнай.

Фёдар Іванавіч Аніська без усялякіх перабольшанняў быў унікальны чалавек. Пагадзіцеся, у няпоўныя 17 год узначаліць буйны сельскі Савет — і гонар, і рызыка. Асабліва пасля вайны і асабліва ў Заходняй Беларусі. У такіх умовах без асабістай мужнасці не выжыць. Магчыма, менавіта гэтая якасць і перадалася яго ўнуку.

Фёдар Рымавіч Мірзаянаў нарадзіўся 9 снежня 1990 года. Тыя, хто верыць у наканаванасць чалавечага лёсу, лічаць, што шмат залежыць ад умоў нашага прыходу ў гэты свет. Калі так, то тут можна толькі пазайздросціць, бо нараджэнне адбылося ў перыяд вялікага жыццёвага поспеху яго маці. За паўгода да таго яна была ўдзельнікам Усесаюзнага з'езда творчых выкладчыкаў педагагічных вучылішч. Для 30 год гэта больш чым салідна.

Бацька юнака, Рым Мірзаянаў, па спецыяльнасці інжынер-сістэматэхнік, адзін месяц працаваў у Расіі, а другі месяц знаходзіўся ў Беларусі. І амаль цалкам прысвячаў яго выхаванню сына. Маці, Людміла Мірзаянава, якая зараз з'яўляецца кандыдатам псіхалагічных навук, у гэты час вельмі шмат увагі надавала сваёй навуковай дзейнасці, таму Фёдар, слава Богу (яе словы), вельмі хутка стаў СВАБОДНЫМ чалавекам. А галоўнае — прывык адказваць за свае дзеянні.

У школе ён быў вельмі сур'ёзным вучнем. Задаваў шмат пытанняў, якія часам не вельмі падабаліся настаўнікам, таму што прымушалі крытычна думаць і іншых. Пасля выпускнога вечара яны так і сказалі Людміле Фёдараўне: цудоўны ў вас вырас сын, але нам з ім было асабліва цяжка, бо вельмі любіць пытацца...

На школьную вучобу ішло не шмат часу, большасць займалі кнігі, розныя камп'ютарныя праграмы, падрыхтоўка да алімпіяд. А яшчэ, як і бацькі, ён не быў абыякавы да таго, што адбываецца ў краіне.

Адзін са школьных сяброў не так даўно ўспамінаў, як падчас выбараў-2001 таемна ад бацькоў, ноччу яны клеілі па Нясвіжы ўлёткі з агітацыяй за апазіцыйнага кандыдата. Хлапчукам было тады адначасова і страшна, і цікава. 11 год!!!

Па даручэнні настаўнікаў Фёдар праводзіў у класе палітінфармацыі і ставіўся да гэтага вельмі сур'ёзна. Заўсёды чытаў шмат газет і крытычна, удумліва аналізаваў іх змест.

У 2003 годзе бацькі сустракалі яго з Італіі. У 12-гадовым узросце ён стаў удзельнікам міжнароднага фестывалю дзіцячага кіно, які штогод праходзіць у ліпені ў італьянскім горадзе Джыфані. Дакладней, быў сябрам журы. Там ён упершыню меў зносіны з замежнымі кінематаграфічнымі зоркамі, сустрэча з якімі адбылася ў так званым памаранчавым садзе. Першымі словамі пасля вяртання на радзіму тады былі "Мы павінны жыць, як у Еўропе!!!"

Быў год, калі ён удзельнічаў адразу ў трох гарадскіх алімпіядах - па гісторыі, праграміраванні, геаграфіі. Усё гэта адбылося на працягу аднаго тыдня. Па першых двух прадметах заняў першыя месцы, а на алімпіядзе па геаграфіі — трэцяе. Так інтэнсіўна на іх працаваў, што, калі прыйшла расслабуха, арганізм не вытрымаў і хлопчык захварэў. На працягу дня ён не ўставаў з ложка.

Асобна трэба сказаць пра яго бабулю па лініі маці — Ніну Васільеўну Аніська. Фёдар з дзяцінства любіць працаваць на яе агародзе, слухаць успаміны "пра немцаў" і пра тое, як яны жылі "пры Польшчы". Вяртаючыся ад яе, нязменна казаў, што трэба есці простую беларускую ежу і тады заўсёды будзеш здаровым.

Бабуля Ніна чакае свайго памочніка кожны дзень і не разумее, чаму яны яго забралі і каму гэта было патрэбна...

Натуральна, што пасля заканчэння школы Фёдар сваю будучую ВНУ абіраў сам — Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Дакладней — факультэт менеджменту па спецыяльнасці "эканамічная кібернетыка". Дарэчы, менавіта такой была спецыялізацыя і ў вядомага беларускага эканаміста Леаніда Злотнікава.

Паступіў на так званае бюджэтнае аддзяленне, якое дазваляе не плаціць грошы за навучанне. Студэнты расказваюць, што там вучацца альбо вельмі разумныя, альбо "блатныя".

Паспяхова перайшоў на трэці курс, але зімовая сесія пакуль стала апошняй у яго студэнцкай біяграфіі. Паспеў здаць усе залікі і тры экзамены. Чацвёрты (апошні) быў прызначаны менавіта на 25 студзеня. Упэўнены, следчыя гэта ведалі добра (магчыма, праслухвалі), таму ў дзверы кватэры Фёдара Мірзаянава пагрукалі ўжо ў сем гадзін раніцы.

За некалькі дзён да гэтага па тэлефоне яго запрасілі "для размовы" ў ваенную контрразведку. Калі б пайшоў, то трапіў бы ў "амерыканку" (КДБ), якая лічыцца больш "элітнай" установай, але ён папрасіў пісьмовую павестку і трапіў на "Валадарку" (МУС).

Пасля "знаёмства" (праз дзверы) са следчымі, Фёдар адразу патэлефанаваў свайму дзядзьку Сяргею Аніську, якога мае калегі добра ведаюць не толькі як былога афіцэра КДБ, але і па рабоце ў Беларускім Хельсінкскім камітэце. Той параіў сказаць, што дзверы будуць адчыненымі толькі пасля яго прыезду. Грукаць перасталі, а праз паўгадзіны двое апранутых "у цывільнае міліцыянтаў ужо паказвалі свае службовыя пасведчанні.

Адпаведны шматгадовы вопыт падказваў Сяргею Аніську, што яго пляменніка арыштуюць, але на самай справе гэтага магло б не адбыцца. Паўдня Фёдара Мірзаянава цягалі з кабінета ў кабінет, прапаноўвалі напісаць нешта накшталт даносу на канкрэтных палітыкаў (што, на жаль, і зрабіў адзін вядомы палітык) і тады адпускалі "на ўсе чатыры бакі".

Фёдар Мірзаянаў адмовіўся і адразу трапіў за краты.

І яшчэ. Я **прынцыпова** прытрымліваюся экуменістычных поглядаў (не толькі наконт хрысціянства) і **прынцыпова** лічу, што БОГ у людзей адзін. Толькі называем мы яго па-рознаму. Сям'я Мірзаянавых — яскравае таму пацвярджэнне. Бацька — мусульманін, маці — праваслаўная хрысціянка, але галоўнае не ў канфесіях. Галоўнае, што яны пасялілі Бога ў душы сына.

Размова першая

Мая размова з яго маці Людмілай Фёдараўнай цягнулася дзве з паловай гадзіны. За ім я зразумеў — гэтую жанчыну немагчыма зламаць "праз калена", да чаго ўлады прыстасаваліся за 17 год свайго панавання. Як і яе сына. Такія людзі не могуць жыць, схіліўшы галаву, і падпарадкоўваюцца асабістаму сумленню па вызначэнні.

Нягледзячы на тое што яна пэўны час працавала ў дзяржаўнай установе, доўга пратрымацца пры гэтай уладзе ў Людмілы Мірзаянавай не атрымалася б усё роўна. Не ўпісваецца гэтая жанчына, на мой погляд, у існуючае зараз асяроддзе. Надта інтэлігентная і надта разумная. Сёння такія не патрэбныя.

Людміла нарадзілася 6 жніўня 1957 года ў Баку. На беларускай вёсцы ў тыя часы жылі вельмі голадна, і яе маці, Ніна Васільеўна, прыехала туды на камсамольскую будоўлю (пад азербайджанскай сталіцай узводзілі гідраэлектрастанцыю). А бацька, Фёдар Іванавіч (прапаршчык і таксама беларус), у тых краях служыў у войску. У выніку знаёмства ўзнікла каханне, а потым нарадзілася дзяўчынка Люда, якая пражыла ў Азербайджане першыя 10 год свайго жыцця.

Можа, там у яе характары і з(явілася тое, што і адрознівае этнічных беларусаў ад карэнных. Магчыма, камусьці такая выснова падаецца спрэчнай, але я лічу, што тыя, хто нарадзіўся за межамі Беларусі, да дзеянняў любой улады ставяцца больш крытычна, чым "тутэйшыя". Яны пратэстуюць на галоўных пляцоўках, а нашы людзі — больш на кухнях.

Сказаць, што дзяцінства Людмілы Мірзаянавай прайшло толькі на Каўказе, было б няправільна, бо, калі скончыўся дэкрэтны адпачынак, яе адвезлі ў вёску Кавалі Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці, і час ад часу дзіця жыло ў дзядулі з бабуляй. А ў 10-гадовым узросце пераехала ў Беларусь на пастаяннае месца жыхарства. Дакладней, у Нясвіж, дзе пачала вучыцца ў пятым класе сярэдняй школы №2.

Яе бацька і дзед шчыра захапляліся гісторыяй, таму цалкам лагічна, што гэтую галіну абрала і дачка, але па парадзе маці (раптам не пройдзеш конкурс) вырашыла падстрахавацца інстытутам замежных моў. Як кажуць у такіх выпадках, быццам бы глядзелі ў ваду.

ДАВЕДКА

Фёдар Мірзаянаў нарадзіўся 9 снежня 1990 года ў Баранавічах. Скончыў гімназію, у 2008 годзе паступіў у Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Пасля падзей 19 снежня адбыў адміністрацыйны арышт тэрмінам 15 сутак. 25 студзеня 2011 года быў зноў арыштаваны. Прад'яўлена абвінавачанне ў здзяйсненні злачынства па арт.293, ч.1 і 2 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь ("Масавыя беспарадкі"). 14 мая 2011 года асуджаны на 3 гады зняволення. Вядомая праваабарончая арганізацыя "Міжнародная амністыя" прызнала яго палітвязнем.

Пасля іняза быў год працы ў сельскай школе і Эфіёпія, куды Людміла паехала са сваім першым мужам Мікалаем, бацькам яе сына Антона. А потым зноў было вяртанне ў Беларусь і выкладанне ў педагагічным каледжы Баранавічаў. Дарэчы, выкладаць належала педагогіку і псіхалогію. Нягледзячы на дыплом іняза...

Мабыць, на такое рашэнне паўплывала кароткачасовая, але вельмі паспяховая праца ў гарадскім Доме школьнікаў, дзе яна рыхтавала святы (без інстытута культуры!!! — **Заўвага аўтара**) для ўсяго горада. Спецыяльнай адукацыі не было, але быў досвед асабістай грамадскай дзейнасці, якая вельмі часта факсіравалася на нейкіх канцэртах.

Так лёс "перавёў" яе ў зусім іншую галіну чалавечага жыцця.

Хаця педагагічную адукацыю яна ўжо мела, на новай пасадзе гэтага было яўна недастаткова. І Людміла пайшла вучыцца зноў. На базе Дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка яна атрымала дыплом практычнага псіхолага.

Было гэта ў 1990 годзе. Літаральна напярэдадні нараджэння Фёдара. І праз два гады пасля развітання з першым мужам.

Рым Мірзаянаў родам са сталіцы Башкортастана Уфы. Яго бацькі Мубарак і Данія — прававерныя мусульмане. Бабуля Фёдара, Данія, калі выйшла на пенсію, скончыла мусульманскую духоўную школу. Чытае і піша на арабскай мове.

Менавіта ў Башкортастане з сябрамі бацькі Фёдар неаднаразова падарожнічаў на Уральскія горы і сплаўляўся па горнай рэчцы Інзер. Яго равеснікі-расійцы спрачаліся з ім наконт ролі Расіі і Беларусі ў сучасным свеце. Працяглыя дыскусіі заўсёды канчаліся спевамі каля кастра. Высоцкі, Акуджава, іншыя барды збліжалі больш, чым пустапарожнія шматгадовыя размовы пра інтэграцыю.

Ад бацькі Фёдар узяў стрыманасць і цвёрдасць духу, а ад маці — свабодалюбства. Падчас Савецкага Саюза Рым Мубаракавіч (1983 год) скончыў авіяцыйны інстытут, пасля якога адбываў свой вайсковы абавязак у Баранавічах. Там і адбылося знаёмства з Людмілай.

Усе акалічнасці тагачаснай "Санта-Барбары" пераказваць няма сэнсу. Адзначу толькі, што сысці ад чалавека, з якім пражыў дзесяць год, — учынак. І няма нічога дзіўнага ў тым, што праз шмат год учынкі пачне рабіць і яе сын.

Ніхто не будзе спрачацца з тым, што настаўнік у нейкім сэнсе — акцёр, бо яму патрэбна ўмець добра кіраваць тварам, голасам, жэстам і г.д. Усё гэта трэба рабіць эстэтычна, прыгожа. Даруйце за "прапісную ісціну", аднак рыхтаваць сапраўднага выкладчыка азначае не толькі механічную рэтрансляцыю ведаў у пэўнай галіне, але і навуку перадаваць іх іншым. Можа быць, менавіта па гэтай прычыне прапанаваны Людмілай Мірзаянавай дыдактычны (навучальны) тэатр у айчыннай педагогіцы напрыканцы 80-х гадоў мінулага стагоддзя стаў вельмі значнай з'явай. Настолькі, што калі звычайны педагагічны каледж атрымаў статус вышэйшага (стаў інстытутам. — **Заўвага аўтара**) яе прызначылі прарэктарам на навуцы. Але спачатку была абарона кандыдацкай дысертацыі ў 1997 годзе.

"Кіравала навукай" Людміла Мірзаянава доўгія сем год. І не проста "ляжала на пасадзе", што сёння стала амаль прыкметай часу, а ПРАЦАВАЛА. Маюцца на ўвазе шматлікія міжнародныя навуковыя канферэнцыі па праблемах прафесійнай адаптацыі, міжнародныя канферэнцыі моладзі. У Баранавічы пачалі прыязджаць выдатныя навукоўцы ў галіне псіхалогіі і педагогікі не толькі з Беларусі, але і з Балгарыі, Украіны, Расіі. Дарэчы, многія пасля арышту Фёдара Мірзаянава будуць пісаць лісты ў яго падтрымку.

Звычайна іх мерапрыемствы праходзілі па некалькі дзён і складаліся не толькі з адных дакладаў, але (пераважна) і з практычных заняткаў, бо для Людмілы Мірзаянавай навуковец — гэта не толькі той, хто ў лабараторыі дзеля навукі вывучае нейкую праблему. Яго тэмы павінны ісці ад жыцця і цалкам адпавядаць патрэбам чалавека.

Сёння пра гэта таксама многа гавораць, але далей пустых лозунгаў справа не ідзе. Людміла Мірзаянава ўсё зразумела і адразу стала "палітычна ненадзейнай".

У 2005 годзе ў Нацыянальным інстытуце адукацыі яна скончыла дактарантуру па педагагічнай псіхалогіі, але абараніцца на тэрыторыі Беларусі не змагла. Пры адпаведным галасаванні не хапіла аднаго голасу...

У 2004 годзе на базе Баранавіцкага вышэйшага педагагічнага каледжа з далучэннем шэрагу прыватных навучальных устаноў (цалкам не падрыхтаваных да такога жыцця) быў створаны ўніверсітэт. Механічна ўсіх аб'ядналі, памянялі шыльду, атрымалі прэзідэнцкае "дабро" і пачалі "тусавацца". Нікога нават не засмуціў відавочны дэфіцыт вартых выкладчыкаў.

Рэктарам прызначылі чалавека звязанага з сельскай гаспадаркай, з Горак, а ўсіх "мясцовых" адштурхнулі ўбок. У тым ліку і Людмілу Мірзаянаву, якой (як з барскага пляча) прапанавалі ўзначаліць адну з кафедраў. Аднак не на тую нарваліся — ісці на незаконнае паніжэнне яна адмовілася і да жніўня мінулага года працавала амаль простым выкладчыкам. Толькі на прафесарскай пасадзе.

Разуменне "новымі" незаконнасці сваіх дзеянняў прыводзіла да таго, што ў адрозненне ад іншых крэслаў з верасня па снежань 2004 года месца прарэктара па навуцы было вакантным. Як кажуць, і хочацца, і колецца. Нонсенс: універсітэт працуе, а за навуку ніхто не адказвае.

Людмілу Мірзаянаву нават хацелі на гэтую пасаду вярнуць, і некаторыя паспяшаліся павіншаваць. Але — не атрымалася. І зноў па палітычных прычынах. Аднойчы вечарам у яе дзверы сталі грукаць і патлумачылі, што праводзяць нейкае сацыялагічнае апытанне. Адразу пацікавіліся адносінамі да ўлады. Адказваць на яўна правакацыйнае пытанне яна адмовілася, аднак сярод іншага сказала, што, на яе погляд, свабоды ў краіне недастаткова. Гэтага хапіла для таго, каб "сацыялагічнае апытанне" імгненна скончылася...

Размова другая

З Беларусі Людміла з'ехала ў жніўні 2010 года ў Паўднёва-Сахалінск, дзе зараз працуе яе муж. Пачала працаваць і яна ў Сахалінскім дзяржаўным універсітэце, а вярнулася ў Беларусь толькі падчас суда над сынам.

Рым Мірзаянаў так зрабіць не змог, таму "ролю" бацькі часова ўзяў на сябе Сяргей Аніська.

Нягледзячы на тое, што мы сябруем ужо шмат гадоў, на свой сорам, я не ведаў, што Фёдар Мірзаянаў з'яўляецца пляменнікам менавіта яго. А яшчэ — пра вельмі цікавы жыццёвы шлях майго сябра.

Праўда, пачаў яго Сяргей Аніська з аповеду пра свайго бацьку. І гэта невыпадкова, бо той быў сапраўды неардынарнай асобай. На жаль, усяго ў 58 год яго забраў інсульт. Самае цікавае, што за два дні да смерці ён доўга размаўляў са сваім сынам. Распавядаў пра сваё жыццё, дэталі вайсковай службы, знаёмства з маці, нараджэнне дзяцей, унукаў і г.д. Чаму гэта адбылося менавіта тады, вядома толькі на нябёсах. Магчыма, чалавек спяшаўся выгаварыцца... Як бы там ні было, Сяргей Аніська (як і многія з нас) шкадуе, што такіх грунтоўных гутарак было вельмі мала...

Фёдара Іванавіча Аніську прызвалі ў армію менавіта ў той час, калі пачалося сумна вядомае "хрушчоўскае" скарачэнне і тэрміны яшчэ не былі дэталёва адрэгуляваны. Прызывалі на пяць гадоў, праслужыў толькі тры, але за гэты час яго буйны сельсавет падзялілі на некалькі "нармальных". Пасады там занялі іншыя людзі, і ён вырашыў застацца ў арміі на звыштэрміновую. Спачатку служыў у артылерыі, потым у чыгуначных войсках, а затым ва ўрадавай сувязі КДБ.

Апынуўся там, па сутнасці, выпадкова, але гэта выпадковасць (а можа, зігзаг лёсу?) і дазволіла вярнуцца з азербайджанскага Баку ў родную Беларусь. Аднойчы ўся іх сям'я ехала сюды ў адпачынак. Суседам па купэ аказаўся афіцэр з Нясвіжа. Ён прапанаваў перайсці да іх і абяцаў дапамогу з пераводам.

Упэўнены, падобных прыкладаў можа багата ўспомніць кожны з нас і пацвердзіць тое, што часцей за ўсё яны абмяжоўваюцца звычайным купэйным знаёмствам. Гэты выпадак можна назваць прыемным выключэннем, бо Аніські хутка сапраўды аказаліся ў Нясвіжы.

Там яны пражылі да 1974 года, пакуль Фёдара Іванавіча не накіравалі ў Манголію. У горадзе Дзуун-Хараа гэтай краіны Сяргей скончыў школу і атрымаў унікальны атэстат на мангольскай мове, які больш падобны на нейкую жэсаўскую даведку, чым на дакумент, які пацвярджае сярэднюю адукацыю. Цяпер Сяргей з вялікай цяжкасцю можа вылічыць канкрэтна, за што атрыманы канкрэтныя адзнакі, але гэта і неістотна. Тады ў хлапчука не было ніякіх вагання наконт выбару жыццёвага шляху — толькі афіцэр. Ды і не магло быць інакш, бо ўсё сваё невялікае на той час жыццё ён правёў выключна ў ваенным асяроддзі.

А вось з выбарам вайсковай прафесіі сыну дапамог бацька. Жыццёвы вопыт лёгка разбіў юнацкі рамантызм, і Ленінградскае вучылішча падводнага плавання імя Ленінскага камсамола засталося за дужкамі. Як і Саратаўскае верталётнае. Замест усяго гэтага быў прапанаваны аўтамабільны накірунак, што было таксама даспадобы Сяргею, бо кіраваць ён навучыўся яшчэ ў школе. А галоўнае — не перашкаджала потым пайсці па слядах бацькі.

Адпаведных ваенных вучылішчаў у Савецкім Саюзе тады працавала толькі чатыры, таму выбар быў невялікі. Усурыйск адразу быў адрынуты па той прычыне, што знаходзіўся на другім канцы СССР. Чалябінск "адпаў" з-за чыста кліматычных умоў. Холад пасля Манголіі Сяргей прынцыпова не любіў. Аўтамабільнае вучылішча ў Разані лічылася суперэлітным, і туды траплялі пераважна па блаце, таму застаўся Самарканд.

На апошніх курсах да іх тройчы прыязджалі "пакупнікі" з асобага аддзела КДБ Туркестанскай ваеннай акругі. Спачатку жадаючых было за сотню, а пасля таго, як высветлілася, што служыць выпадае ў Афганістане, такое жаданне выказалі толькі шэсць чалавек. Сяргей Аніська быў сярод іх, але афіцыйна накіравалі яго ў роднае вучылішча камандзірам курсанцкага ўзвода. І толькі потым — у Ташкент, а адтуль — у Кабул.

Спачатку быў памочнікам начальніка штаба батальёна 58-й аўтамабільнай брыгады, а потым узначаліў роту. Для маладога лейтэнанта гэта магчыма толькі на вайне. А вайна там была сапраўднай, бо аўтамабільныя калоны атакавалі часцей за ўсё, і таму 49 рэйсаў (52 тыс.км!) Сяргея Аніські гавораць самі за сябе. І галоўнае — ён ніколі не быў тым афіцэрам, які хаваецца за спінамі падначаленых.

Дарэчы, з КДБ яго знайшлі і там, аднак было гэта перад самай заменай у беларускі Слонім. Ужо адтуль Сяргей паступіў у Новасібірск на вышэйшыя курсы ваеннай контрразведкі. Скончыў іх у ліпені 1985 года, і яго (па легендзе студэнта Новасібірскага інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту) накіравалі на месяц на Маскоўскі фестываль моладзі і студэнтаў.

Сэнс той работы зразумелы, таму засяроджу вашу ўвагу выключна на тым, што пасля "сталічнай камандзіроўкі" Аніська на год трапіў у асобы аддзел КДБ па Брэсцкім гарнізоне. Потым былі Камянецкі раён і Мінск, дзе яму давялося працаваць у інфармацыйна-аналітычным аддзеле (ІАА), і пасада намесніка начальніка ваеннай контрразведкі ў Мар'інай Горцы.

Калі Беларусь стала незалежнай, яго прызначылі кіраўніком ІАА. Так было да 1995 года. Менавіта ў гэты час стала цалкам зразумела тое, які шлях абралі новыя ўлады, і тое, што яны будуць трактаваць законнасць, мякка кажучы, вельмі фрывольна.

Прашу прабачэння за банальнасць, але ў жыцці кожнага з нас бываюць моманты, калі канкрэтны ўчынак вызначае далейшы лёс чалавека. Падрабязна распавядаў пра біяграфію Сяргея Аніські я цалкам невыпадкова, бо хацеў паказаць, што здольнасць ісці супраць цячэння схавана ў іх родзе на генетычным узроўні. І гэта не проста пафасныя словы.

Як і пляменнік у снежні 2010 года, у 1995-м Сяргей абраў шлях, які нельга назваць канфармісцкім. Служыць падпалкоўнік Аніська мог бы яшчэ шмат год (пасада дазваляла), але зрабіў інакш. Ён сышоў. Сышоў, каб не быць побач з тымі, хто плюе на любую мараль.

Размова, якая абавязкова будзе

Для Фёдара Мірзаянава Сяргей Аніська не проста дзядзька. Ён — хросны бацька. Таму адчувае адказнасць за пляменніка перад БОГАМ. І ганарыцца, бо змагацца за праўду значна цяжэй, чым рабіць выгляд, што ўсё вакол "стабільна".

Напярэдадні нашай сустрэчы ў Фёдара Мірзаянава з'явіўся другі адвакат. Бацька юнака — грамадзянін Расіі, таму новы адвакат адразу пачаў высвятляць пра адносіны да змены грамадзянства. Пэўны сэнс у такіх "метамарфозах" ёсць, бо стаўленне нашых улад да грамадзян Расіі больш лагоднае, чым да мясцовых. З'яўляецца шанц на нейкую лаяльнасць, аднак выкарыстоўваць падобную магчымасць Фёдар Мірзаянаў катэгарычна і прынцыпова адмовіўся.

Учынак, наконт якога варта ў знак павагі зняць капялюш!

Кватэра, дзе жыве Фёдар Мірзаянаў, месціцца амаль насупраць вайсковай часці, якую раней называлі "брыгадай сувязі на Маякоўскага". Новая ўлада кардынальна змяніла не толькі шыльду, але і сутнасць вайскоўцаў. Цяпер там падраздзяленне ўнутраных войскаў. Тыя самыя "касманаўты", якія даўно перасталі баяцца крыві суайчыннікаў.

Расказвалі, што амаль кожны дзень яны трэніруюцца ваяваць з "натоўпам". Шчыты, гумовыя дручкі, шлемы. "Зорныя войны" па-беларуску.

Магчыма, гэтыя хлопцы і "працавалі" 19 снежня 2010 года. Магчыма, нехта з іх і "зачысціў" тады студэнта, які жыве амаль насупраць іх казармаў.

Падчас гутаркі з Людмілай Мірзаянавай, якая апошнім часам шчыльна займаецца праблемамі маладзёжнай наркаманіі, вакол нас настойліва хадзіў кот з мянушкай Пушысцік. Усім сваім выглядам дэманстраваў, што ў адсутнасць гаспадара самы галоўны там ён. Ды і сама адсутнасць — часовая справа.

Я думаю таксама так, таму спадзяюся ў недалёкім будучым паразмаўляць з чалавекам, якога пакуль не ведаю асабіста, але вельмі паважаю завочна.

Аляксандр ТАМКОВІЧ.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
20 ВЕРАСНЯ 2011 г.

«КРУГЛЫ СТОЛ»: БЫЦЬ ЦІ НЕ БЫЦЬ?

РЕБРОМ!

Только пыль в глаза пускать?

Эти "почему?" не дают покоя ни днем ни ночью. Почему наша страна оказалась в яме? Почему мне, человеку непьющему и некурящему, в совершенстве владеющему своей профессией и тем не менее вынужденному вкалывать, чтобы прокормить семью, на двух работах, приходится влачить полунищенское существование? Почему мне никто из тех, кто у руля, не может дать вразумительный ответ?

С утра до вечера прикорытная пропаганда полощет нам мозги. Мол, ничего страшного не происходит. Ну, ошиблись маленько, всего-то и думали, что деньги из воздуха берутся, вот и раздавали перед президентскими выборами налево и направо, чтобы людям понравиться... Спрашивается, что же это за руководители государства, которые "думают" на уровне первокурсника, провалившего экзамен по экономике?

Нет ответа. И снова — очередная порция лапши на уши вперемежку с детским лепетом. Уж на что наш народ терпеливый и толерантный (может, даже слишком терпеливый), но я не знаю таких, кто бы сейчас верил трелям руководящих "соловьев".

Ну и "повезло" же белорусам так влипнуть в историю! То российские цари-императоры, уничтожившие и поглотившие наше былое государство Великое Княжество Литовское, то Ленин со своим помешательством на "мировой революции", то Сталин с безумной любовью к ГУЛАГу... Хрущев, Брежнев и т.д. только и думали, как держать в узде народы СССР и в страхе перед ракетно-ядерным ударом весь мир...

Казалось бы, став в 1991 году вновь независимым государством, наконец-то заживем как люди: стартовые условия для устройства жизни по-новому у Беларуси были получше, чем у других былых советских республик. Но, увы! Свои, уже сегодняшние белорусские "царьки", то ссорясь, то прогибаясь перед Россией, завели нашу "синеокую" в тупик. И ничего кроме пустой болтовни не слышно. Какие тут "круглые столы", зачем они — только пыль в глаза пускать?

Опять эти мои "почему?" остаются без ответа.

В.М. ПОТЕМКИН,
житель г.Могилева.

Галоўнае, каб было на карысць

Мяркую, садзіцца за стол для дыскусіі з цяперашняй уладай сур'ёзным грамадскім дзеячам, на мой погляд, няма ніякага сэнсу. Перамовы патрэбны ўладзе таму, што яе рэйтынг, як кажуць у народзе, апусціўся "ніжэй плінтуса" і стаўка робіцца на чарговы спектакль.

Да таго ж ёсць галоўная рэч, без якой гаварыць няма аб чым, — гэта вызваленне ўсіх палітвязняў, кампенсацыя ім маральнага і матэрыяльнага ўрону. Прычым не за кошт ні ў чым не вінаватых падаткаплацельшчыкаў, а з кашалькоў тых самых пракураў, следчых, суддзяў, міліцыянтаў, якія ляпілі ліпавыя справы, а таксама тых, хто аддаваў ім незаконныя загады. Афіцыйна лічыцца, што судовая сістэма ў краіне незалежная, а насамрэч?

Што ж тычыцца дыялогу па адраджэнні эканомікі, то... Ёсць жа глыбокія, абгрунтаваныя перадвыбарныя праграмы экскандыдатаў у прэзідэнты на выбарах 2010 г., там усё пралічана і прапісана, што неабходна рабіць, каб краіна не звалілася, як зараз адбылося, у "балота". Уладзе трэба было б уважліва папрацаваць над гэтымі дакументамі і з іх выбраць лепшае. Але ж там, дзе пануюць меркаванні аднаго, калі хто ўносіць слушныя прапановы, яго адразу запісваюць у апазіцыю ці "пятую калону". Гэта няправільна. Калі ж прапановы каго б там ні было пойдуць на карысць краіне, іх трэба ўлічваць у сваёй дзейнасці.

І. АЛІХВЕР,
жыхар п.Варапаева
Пастаўскага раёна.

ПОГЛЯД СКЕПТЫКА

Голая дэкларацыя

Тое, што пачулі грамадзяне Беларусі пра "круглы стол" улады, апазіцыі і прадстаўнікоў Еўропы ды Расіі, — голая дэкларацыя. Можна сказаць, дэмагагічны жэст. Або нават экспромт. Ці "пробный шар".

Сур'ёзныя прапановы гэтак не робяцца. У сур'ёзных прапановах называюцца: мэты, месца, час, магчымыя ўдзельнікі дыялогу, парадак дня і нават прапануецца праект рэгламенту. Нарэшце, у сур'ёзнай прапанове павінна быць паказана, як гэты "круглы стол" будзе асвятляцца ў СМІ — перш-наперш электронных, якія ў нас належаць выключна дзяржаве.

З другога боку: што прапанаваў Лукашэнка — дыялог ці перамовы?

Калі дыялог, дык гэта пустая гаварыльня. „Посидели, погалдели, разошлись".

Калі перамовы, дык яны павінны скончыцца падпісаннем усімі бакамі дакумента, абавязковага для выканання кожным удзельнікам "круглага стала". Або не скончыцца.

Пра тое, што сам Лукашэнка не ведае, што ён канкрэтна прапануе, на мой погляд, сведчыць стыль, тон прапановы: "сядаць за стол (круглы, квадратны)". Падаецца, гэта не тон дзяржаўнага мужа.

Лукашэнка нават не вызначыўся, каму ж канкрэтна ён прапанаваў або збіраецца прапанаваць удзел у дыялогу (ці перамовах?). *"Я прапанаваў і Еўрапейскаму Саюзу, хацеў бы прапанаваць і Расіі, іншым еўрапейскім і міжнародным структурам накіраваць сваіх прадстаўнікоў для ўдзелу ў гэтым "круглым стале"*.

Калі нейкі бок прапануе перамовы іншаму, ён (прынамсі, вонкава) дэманструе павагу да яго. Лукашэнка ж запрашае замежных прадстаўнікоў, каб яны заадно паглядзелі, *"хто ў нас чаго варты, якія ідэі вылучае і якія мэты перад сабой ставіць"*. У гэтых словах крыецца непавага да прадстаўнікоў дэмакратычнай апазіцыі. Намякаецца на тое, што яго апаненты мала чаго вартыя або зусім нічога не вартыя. Акрамя таго, хаваецца намер выкарыстаць дыялог (ці перамовы?) для дэмагогіі. На ўзбраенне бярэцца бальшавіцкая тактыка. Так і згадваецца Леў Троцкі, які мірныя перамовы з Германіяй і яе саюзнікамі ў Брэсце выкарыстоўваў для прапаганды.

Такія форма і змест заявы Лукашэнкі.

Прычына гэтай заявы відавочная: сістэмны крызіс, недавер большасці грамадзян да ўлады, да яе палітыкі. Адсутнасць стратэгіі, тактыка "абы дзень прастаяць ды ноч пратрымацца" прывяла краіну ў тупік. Беларусь стаіць напярэдадні дэфолту. Патрабуюцца кардынальныя, рэвалюцыйныя паводле свайго зместу рэформы.

У заяве Аляксандра Лукашэнкі нічога канкрэтнага не сказана наконт мэты дыялогу (перамоў?). А менавіта пытанне аб рэформах і перш-наперш аб рэформе палітычнага ладу краіны павінна стаяць на парадку дня дыялогу (перамоў?).

Як я бачу, мэта ў Лукашэнкі адна — пратрымацца ва ўладзе як мага даўжэй. Ён ведае, што яго палітыка — шэраг памылак і, мякка кажучы, адхіленняў ад норм права. Самая вялікая праблема для яго — сыход з улады.

Пратрымацца ва ўладзе і трымацца за ўладу Лукашэнку дапамагае выбудаваная ім палітычная сістэма, палітычны рэжым. Што-небудзь мяняць у гэтай сістэме і рэжыме ў бок дэмакратызацыі, я лічу, ён не мае ніякага намеру. Заўважце: ЁН НІЧОГА НЕ СКАЗАЎ АБ ПАТРЭБЕ ПАЛІТЫЧНЫХ ПЕРАМЕН.

Выкажу і такую думку: Лукашэнка прапанаваў нейкі "круглы стол" з мэтай зноў увесці ў зман Захад і зноў атрымаць на падтрымку свайго рэжыму грошы. Надыходзіць час выплачваць даўгі. І Лукашэнка хацеў бы адцягнуць тэрміны і ўмовы іх выплаты. Такое яму ўжо ўдавалася ў 2008-м і 2010 гадах, калі ён абяцаў больш-менш справядлівыя выбары. Тады падманваўся не толькі Захад, але і некаторыя нашы дэмакратычна настроеныя грамадзяне, якія лічаць сябе палітыкамі.

Анатоль СІДАРЭВІЧ.

ЛИЧНОЕ МНЕНИЕ

Сговор?

Добрый день! Хочу ответить на вашу статью "Дыялог пра дыялог". Хочу спросить: а какая численность наших оппозиционных партий? Или это секрет? Я думаю, не более 5000 человек в каждой. Шесть крупных партий (плюс кампания "Говори правду!") на 5000 — получаем 30.000 человек. Избирателей в РБ около 6.500.000. 30.000:6.500.000 и умножить на 100% — получаем приблизительно 0,5%. Следовательно, такой процент оппозиция будет представлять за "круглым столом". Кажется, это будет партия в шахматы, когда противник может смахнуть с доски все фигуры, а потом ударить соперника по голове, а соперник не сможет дать ему сдачи.

Я считаю так: "круглый стол" нужен для узаконивания власти А.Лукашенко (ведь за столом соберутся все: Евросоюз, Россия, власть и оппозиция). А вот сильная Беларусь никому не нужна — ни России, ни Евросоюзу, ни А.Г.Л. Беларусь сильная нужна только нам, белорусам. Зато после "круглого стола" можно будет спокойно: распродавать госсобственность, подписывать договоры. Все ведь сидели за одним столом и "решали вопросы". И покупатели могут спать спокойно: у них ничего не отнимут (как это было в Венесуэле), если власть вдруг поменяется. Жаль, что предательство Беларуси идет под лозунгом "Спасем Беларусь!".

P.S. Может, это мое богатое воображение, но, я думаю, не случайно кредит 2 млрд для "Беларуськалия" выделяли две страны — Россия и Германия. Будто бы у России не было лишнего миллиарда долларов для такой выгодной сделки.

Вадим Иванович ЛАБОР.

Гродно.

...И уйти в отставку

Дожили! Наш "сентиментальный" президент (по определению тов.Ананьева) "созрел" для разговора с... представителями всех политических сил. Белорусское экономическое чудо, белорусская экономическая модель "ляснули"? А что было 17 лет? Он наконец готов сидеть за одним столом ("круглым", "квадратным") с "отморозками", "вшивыми блохами", "свядомымі", "мычащими", "шелудивой массой", со всякими там "козлами", "баррозами"? Это искреннее переосмысление своей политики? Или очередной вброс "наживки" доверчивым белорусам и зарубежному сообществу? Этакий демократический посыл, как было перед президентскими выборами? И чем все закончилось? В нынешней ситуации я вижу единственный выход — признать полную несостоятельность проводившейся политики, извиниться перед белорусским народом за оскорбления и уйти в отставку. Принять такое решение надо самому — не ждать, пока "помогут". Не надо бесконечно манипулировать сознанием народа, даже такого "памяркоўнага", как белорусы. Всему есть предел.

Тамара БЕЛАЯ.

Минск.

Звяртайцеся ў ААН

Дарагая рэдакцыя! Краіна знаходзіцца ў такім стане, што Лукашэнка вымушаны звярнуцца да апазіцыі з заклікам прыняць удзел у "круглым стале".

Апазіцыі абавязкова трэба адгукнуцца на гэты заклік і прыняць удзел у гэтым "круглым стале", толькі калі на ім будуць прысутнічаць замежныя госці і можна будзе называць рэчы сваімі імёнамі.

Але, крыху падумаўшы, лічу, што гэта будзе самаахвярная акцыя з вынікамі 19 снежня. І адзінае, што нам можа дапамагчы — гэта зварот у ААН

Міхась ДУБЕНЧУКОЎ.

Мінск.

Потеряны 17 лет

Припертый к стене результатами своей же политики, о пагубности которой много лет твердили деятели демоппозиции и просто нормальные, разумные люди, наш кормчий вдруг предложил представителям всех лагерей сесть за "круглый стол" переговоров. Может, его друг Бакиев, исходя из собственного опыта, подсказал? Мол, лучше деловой разговор, чем, сами понимаете... Хотя деловитость и серьезность, а главное — результативность такого предполагаемого диалога, считаю, неосуществима даже в самых дерзких мечтах. О чем говорить, если не выпущены и не оправданы все политзаключенные Площади за несовершенные злодейства? Что же касается намерения закоперщика "круглого стола" *"реально оценить, кто чего стоит"*, общество уже давным-давно оценило и, увы, никому из "сторон" не поставило пятерок. На вопрос, *"что можно сделать для эффективного улучшения ситуации в стране"*, разве непонятен ответ: потребовать добровольного ухода Лукашенко и всей президентской рати в отставку.

Пути выхода из тяжелейшей ситуации специалистами давно найдены. Вот и прислушайтесь к ним, дорогие наши руководители, не дожидаясь "круглого стола", эффективность которого, да и сама его возможность весьма призрачна. Знаем мы по прежним годам такие переговоры! Смех да и только, пустая трата невозвратного времени. Столько уже потеряно — целых 17 лет! Куда они ушли? Вот об этом следует спросить прямо (если "стол" состоится), а не рассусоливать о том, что и так ясно: без поворота руля в стране толку не жди.

З.Р. СЕНЬКО,
житель г.Мозыря.

Выражаю благодарность

Главному редактору газеты "Народная Воля" И.П.Середичу

Уважаемый Иосиф Павлович!

В 2010 г. я оказался в сложной ситуации, столкнувшись с проблемой под названием "капитальный ремонт".

Благодаря Вам в газете "Народная Воля" было опубликовано мое обращение к президенту страны А.Г.Лукашенко. После публикации проблема сразу стала решаться. Сейчас капитальный ремонт подходит к концу. Поэтому я хочу выразить Вам искреннюю благодарность за оказанную помощь. Пожелать Вам и всему коллективу газеты "Народная Воля" творческих успехов в непростом, но очень нужном деле — защите прав граждан.

Слова благодарности я также разместил на своем сайте www.vvm.by, который создал, чтобы оказывать бескорыстную помощь людям, сталкивающимся с проблемами, подобными моему случаю.

С уважением —

А.П.АРТЕМЬЕВ.

Минск.

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ

Чайнік

У адзін з сельскіх магазінаў прывезлі чайнік коштам… 200 тысяч рублёў. Для некаторых вяскоўцаў гэта цэлая зарплата за месяц.

У сельскі магазін звычайны,
Які нішчымны і пусты,
З таварамі прывезлі чайнік,
І ён, падобна, залаты.
Немаладая прадаўшчыца,
Убачыўшы яго цану,
Ад жаху пачала хрысціцца
І ледзь не трапіла ў труну.
Што ў жах магло яе прывесці?
Чаму хрысцілася яна?
Не дваццаць тысячаў, а дзвесце —
Такая чайніку цана!
Пайшла пра чайнік пагалоска,
Вушам не верыў просты люд.
Да крамы збеглася ўся вёска,
Каб паглядзець на гэты цуд.
Стаяў ён, белы, на паліцы,
Навідавоку, балазе
Люд запускала прадаўшчыца
Ім падзівіцца
Па чарзе.
— Ну і за што такія грошы? —
Пляваўся смачна дзед Хвядот. —
Мой самавар зусім не горшы,
Хаця яму ўжо сотня год.
А сапсуецца ён, крый божа,
І трэба чаю выпіць мне,
Дык жонка Наста ў печы можа
Ваду нагрэць у чыгуне.
З падтрымкаю — алкаш Даніла:
— А праўду кажаш ты, стары.
За грошы гэткія "чарніла"
Купіць магчыма скрыні тры.
Аж тыдзень можна "браць на грудзі",
І не жытуха будзе — рай.
Калі "чарніла" столькі будзе,
Дык і нашто мне гэты чай?
І тут жа ўклініўся ў дэбаты
Механізатар Апанас:
— Дык гэта ж трэць маёй зарплаты —
Такія, бач, заробкі ў нас.
Не ў час закінута спажыўка —
Над хлопцам кепікі былі:
— Табе і ўручаць на "Дажынках"
Той чайнік, а не "Жыгулі".
Гула, пасмейвалася вёска,
Было і кпінаў-здзекаў шмат.
А чайнік той стаяў, як "Оскар",
Які чакае наш урад...

* * *

Пакуль там люд дэбаты вёў,
У ступе марна тоўк ваду,
За трыста тысячаў рублёў
Прывезлі ім скавараду.

НЕ МОГУ МОЛЧАТЬ

Кто защитил педофилов?

Пишет вам отставной военный, всем сердцем желающий нашему непоколебимому народу, победившему в составе огромной страны фашизм, только добра.

Никогда не писал в газету, но передача, просмотренная по телевизору в День Независимости, в воскресенье, святой для всех нас православных день, поколебала веру в нашу власть, в адекватность закона, вызвала гнев, возмущение и страх за детей, за внуков. Думал, только в России огромное количество педофилов, этих страшных иродов. Только там те, кто должен защищать детей: депутаты, министры, судьи, прокуроры — стоят на защите ублюдков. Но час назад прочитал, что и в Беларуси есть закон, призванный защищать, оберегать детей от извращенцев, согласно ст.168 УК РБ, оберегает педофилов от справедливого наказания.

Как же так? Прошу президента как мужчину, как отца, воспитывающего малолетнего сына, разобраться, кто из наших депутатов и министров лоббировал такой закон. А если будут защищаться, прошу назначить народный референдум с вопросом: как поступать с педофилами и их пособниками, которые создают законы, которые позволяют надругаться над нашими детьми педофилам СНГ и всего мира?

М.В. ИГНАТЬЕВ.

Минск.

ОТ РЕДАКЦИИ

Статья 168 Уголовного кодекса, которая возмутила нашего читателя, действительно, мягко говоря, спорная. Согласно ей, за половое сношение и иные действия сексуального характера с лицом, не достигшим шестнадцатилетнего возраста, можно даже не попасть в тюрьму.

Так, в виде наказания статья 168 УК РБ предусматривает простое ограничение свободы на срок от двух до четырех лет, а в особо тяжких случаях — небольшое по срокам лишение свободы на срок от двух до пяти лет. При таких сроках, даже оказавшись за решеткой, люди выходят на свободу через год-два.

Справедливо такое наказание или нет — вопрос полемический. Но очевидно, что за надругательство над ребенком наказание должно быть большим, чем за разбитое стекло в Доме правительства.

Все коммунисты в гости к нам!

Пресс-служба Министерства юстиции сообщила, что за восемь месяцев текущего года в Беларуси было зарегистрировано 55 новых общественных объединений, из которых 6 имеют республиканский статус, 1 — международный статус и 48 — местный статус. В то же время попытки представителей демократического лагеря легализовать деятельность в стране своих инициатив (например, компании "Говори правду!") остаются безуспешными. Кто же получает официальную регистрацию в этом году?

И.И.Дудкевич, г.Минск.

В первую очередь нас заинтересовало, что это за новое международное общественное объединение, которое начало свою деятельность. Как оказалось, в Беларуси получило регистрацию Международное общественное объединение "Союз коммунистов". Это, пожалуй, единственная организация, деятельность которой носит ярко выраженный политический оттенок.

К общественным объединениям, которые имеют республиканский статус, например, добавились: Белорусское республиканское общественное объединение врачей ветеринарной медицины непродуктивных животных, Белорусское медицинское общественное объединение "Репродуктивное здоровье", Общественное объединение "Белорусская федерация атлетического фитнеса и культуризма", Республиканская общественная организация "Белорусские мастера гиревого спорта", Белорусское общественное объединение стомированных, Республиканское общественное объединение "Белый аист надежды" и другие.

Кстати, интересно, что в условиях отсутствия денег в Беларуси начали активно плодиться фонды. Так, только за январь—август этого года было зарегистрировано 11 новых фондов: один международный (международный социально-экономический фонд "Идея"), один республиканский и девять местных.

ЧЫТАЧ—ГАЗЕТА

Алкагалізм і Чарнобыль — розныя рэчы

Перапіска з журналісткай Аленай Малочка

Паважаная спадарыня Алена! Прачытаўшы Ваш артыкул у нумары 135—136 "Народнай Волі", я, шчыра кажучы, здзівіўся. Бо сама пастаноўка пытання — алкагалізм і радыяцыя — што больш страшна? — на мой погляд, гучыць вельмі некарэктна. Як некарэктным з(яўляецца і параўнанне, безумоўна, вельмі адмоўнай сацыяльнай з(явы (злоўжыванне спіртнымі напоямі) з экалагічнай катастрофай сусветнага маштабу.

Зразумела, што Вы выказваеце сваю думку, сцвярджаючы: "Лично я считаю, что алкоголизм страшнее радиации", а таксама задаючыся рытарычным пытаннем: "И сколько умерло от Чернобыля?" Але справа ў тым, што алкагалізм — гэта свядомы выбар кожнага чалавека, які сам вырашае, піць яму ці не. А наступствы Чарнобыля — гэта тое, што тычыцца кожнага беларуса і не залежыць ад яго выбару. Радыяцыя забівае кожны дзень, і ад яе паміраюць у тым ліку і дзеці. Напрыклад, у Калінкавіцкім раёне (80 тысяч насельніцтва) на афіцыйным узроўні прызнана, што 14 дзяцей ва ўзросце да 16 год атрымалі інвалідnасць у выніку выбуху на ЧАЭС. Але ж мы ведаем, як дзяржава ставіцца да людзей, якія страцілі здароўе з-за Чарнобыля. Міністэрства аховы здароўя робіць усё, каб не прызнаваць сувязі іх цяжкіх захворванняў з катастрофай на ЧАЭС. А яна ёсць! Пра гэта вам маглі расказаць сотні інвалідаў-ліквідатараў, якія пражываюць у Калінкавіцкім раёне.

Акрамя таго, амаль 1,8 млн жыхароў Беларусі пасля катастрофы на ЧАЭС апынуліся на патэнцыяльна небяспечнай тэрыторыі, якая забруджана радыенуклідамі. Але ж улада не робіць нічога, каб зменшыць пагрозу. Наадварот — уводзяцца ў севазварот "брудныя" землі, на якіх вырошчваецца зерне, гадуецца жывёла. І ўсё гэта потым ідзе ў спажыванне. Такім чынам павялічваецца назапашаная доза радыяцыі. Пры гэтым чалавек можа жыць у адносна чыстай Віцебскай ці Мінскай вобласці, але, спажываючы ў ежу прадукты з забруджаных зямель, ён трапляе ў катэгорыю рызыкі. Аднак наша медыцына пра гэта не кажа, як не кажа пра небяспеку малых доз радыяцыі. А пра гэта трэба не толькі казаць, а біць у званы, як рабіў гэта прафесар Бандажэўскі з Гомеля.

Улады ж на ўсіх узроўнях хаваюць праўду і інфармацыю ад грамадзян... Напрыклад, на мой запыт у Калінкавіцкі райвыканкам з просьбай даць звесткі пра колькасць памерлых у раёне ліквідатараў мне была дасланa адпіска з паведамленнем, што гэта ледзь не сакрэтная інфармацыя! Такая ж, як і пра калектыўную дозу, атрыманую беларусамі пасля выбуху на ЧАЭС, як і сапраўднае разбуральнае ўздзеянне малых доз радыяцыі і г.д. Фактычна нацыя памірае (з 1994 г. колькасць насельніцтва ў Беларусі зменшылася на 500 тысяч чалавек!) пры поўным і, што яшчэ больш страшна, свядомым бяздзеянні ўлад і структур аховы здароўя. А будаўніцтва АЭС у Астраўцы зробіць гэты працэс незваротным...

Я не спрачаюся, алкагалізм — гэта вельмі і вельмі вялікая пагроза для кожнага чалавека, сям(і, грамадства, дзяржавы. Але ж гэта ні ў якім разе нельга параўноўваць з Чарнобыльскай трагедыяй!

Васіль СІЛІВЕРСТ,
удзельнік ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі імя У.І.Леніна.

А калі глянуць глыбей?

Хачу выказацца ў працяг тэмы, што закранула Алена Малочка ў артыкуле "Алкагалізм і радыяцыя".

Добра вядома, пры якіх умовах з'яўляецца п'янства. І таксама вядома, што калі людзей паставіць у чалавечыя ўмовы, то і само п'янства знікне — не будзе падставы для таго, каб заліваць за каўнер і тым самым глушыць нездаволенасць жыццём.

Аб гэтым можна прачытаць і ў Дабралюбава, і ў Энгельса, які на прыкладзе дзейнасці Роберта Оўэна паказаў, што Р.Оўэн дасягнуў гэтай мэты, паставіўшы людзей ва ўмовы, якія адпавядаюць чалавечай годнасці. А сваім апавяданнем "Сон Макара" Караленка паказвае, адкуль і як нараджаецца п'янства. І таму пры чалавечым падыходзе да людзей адпадае патрэбнасць пісаць на бутэльцы з гарэлкай, што гэта яд, і не трэба ствараць алкаголю "чорнае" жыццё. Трэба ўсяго толькі стварыць годнае жыццё для людзей.

І таму лічу, што праблемы алкагалізму ў артыкуле спадарыні Малочка асветлены калі і не павярхоўна, то і не глыбока.

Што ж датычыцца яе погляду на радыяцыю і выкарыстанне АЭС, то ў гэтым пытанні яна яўна паспяшалася з высновамі. Бо на прыкладзе таго, што Германія прыняла план паступовага выключэння АЭС з карыстання, будаўніцтва ў нас АЭС не тое што немэтазгодна, а проста нават злачынна, аб чым не раз пераканаўча даводзілася ў артыкулах, змешчаных у "Народнай Волі" і напісаных не якімісь дылетантамі.

А абранае месца будаўніцтва АЭС — гэта, вобразна кажучы, дамоклаў меч над краінай: бо калі адбудзецца аварыя на АЭС ці тэракт, то, улічваючы пераважна заходнія і паўночна-заходнія вятры, радыяцыйнае воблака пакрые Мінск і значную частку Беларусі. Вось тады мы пазнаем, колькі нам будзе каштаваць "колоссальное количество дешевой энергии".

Ваш чытач —

Міхась ДУБЕНЧУКОЎ.

Мінск.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
20 ВЕРАСНЯ 2011 г.

На зарядку становись!

В Китае модифицировали официальную зарядку для работников, которую ввел Мао Цзедун 60 лет назад

В Китае появилась новая версия официальной программы гимнастической зарядки, адаптированной для "белых воротничков", сообщает The Wall Street Journal. Ученые из Главного управления КНР по вопросам спорта считают, что "хуха" — вокальные элементы зарядки — играют ключевую роль, передает публикацию издания сайт InoPressa.ru.

"Китайцы испытывают как никогда сильное напряжение, им нужен метод разрядки", — говорит Хе Фенсян, директор отдела "спорта для всех". Хе и его коллеги ввели в девятую редакцию "Народной радиозарядки" вышеупомянутые "хуха" — ритмические выкрики, напоминающие обряды первобытных племен.

40-минутная программа физических упражнений, пропагандируемая государством, изобилует выпадами рук и ног в стиле кунг-фу. Ее ввел Мао Цзедун в 1951 году, чтобы подготовить китайский пролетариат к борьбе с капиталистическим Западом, сообщает газета. Сегодня зарядку по-прежнему транслируют по радио, но теперь ее модифицировали для подготовки масс "*к долгому здоровому будущему за компьютером*", как выражается автор публикации.

Ученые и чиновники спортивного ведомства целый год изучали, как изменились организмы китайцев с 1997 года — момента появления восьмой редакции зарядки. Оказалось, что шейные мускулы больше скованы, плечи больше напряжены, а животы пополнели. Поэтому в комплекс включены упражнения на движение плеч, виляние филейной частью и растяжки грудных мускулов. Чтобы успокоить растрепанные нервы, инструкции произносит женщина с нежным, добросердечным голосом. В прежних редакциях команды отдавал мужчина с интонациями военного.

Есть также "хуха" — повторяющиеся хоровые вскрики "Ху! Ху-ха!", включенные в звуковую дорожку радиозарядки: этакая смесь симфонии с цирком, пишет газета. Звучит также барабанная дробь, побуждающая хлопать в ладоши.

На состязаниях команды фирм и организаций уже выкрикивают свои слоганы. Например, команда одного пекинского ресторана, занявшая третье место в городе в категории работников частного сектора, выкрикивала текст, который можно приблизительно перевести так: *"Служи своему обществу! Преданно люби! Показывай себя с лучшей стороны! Всегда стремись быть лучше всех! Давай-давай!"*.

Спортивные чиновники, которые разработали 9-ю редакцию, надеются, что новые упражнения решат растущую проблему ожирения, говорится в статье.

КОРАТКА

Ільготны крэдыт ад Кітая

Урад Кітая прыняў рашэнне аб выдзяленні Беларусі льготнага крэдыту ў 1 млрд долараў ЗША для рэалізацыі сумесных узгодненых праектаў. КНР таксама выдзеліць 70 млн юаняў у якасці бязвыплатнага гранта.

Аб гэтым паведаміў старшыня пастаяннага камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў У Банга на сустрэчы з кіраўнікамі Нацыянальнага сходу Беларусі.

У Беларусі пройдзе Тыдзень кітайскай культуры

Дні культуры Кітая пройдуць у Беларусі з 25 верасня па 2 кастрычніка, паведамляе БЕЛТА.

Афіцыйнае адкрыццё кітайскіх Дзён культуры адбудзецца на Вялікай сцэне Беларускай дзяржаўнай філармоніі, на якой выступяць артысты Аркестра майстроў кітайскай нацыянальнай музыкі.

Праграмай Дзён культуры прадугледжана таксама правядзенне некалькіх выстаў. У прыватнасці, у Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі 26 верасня адкрыецца экспазіцыя "Кераміка і фарфор Кітая". 28 верасня ў Нацыянальным гістарычным музеі будзе прэзентавана выстаўка "Сучаснае мастацтва валакна Кітая". Выстава будзе доўжыцца па 2 кастрычніка.

Дапамога беспрацоўным — 374 еўра

Урад ФРГ адобрыў павышэнне сацыяльнай дапамогі па беспрацоўі Hartz-IV на 10 еўра: з 2012 года яно складзе 374 еўра на аднаго дарослага, паведамляе Welt. Павышэнне тлумачаць агульным ростам заробкаў і цэн за апошнія паўтара года.

Для беспрацоўных сямейных пар дапамога павялічыцца на 9 еўра, да 337 еўра на кожнага чалавека, а памер Hartz-IV на маленькіх дзяцей да пяці гадоў ўзрасце на чатыры еўра — да 219 еўра.

Акцёр Ахлабысцін адмовіўся ўдзельнічаць у выбарах прэзідэнта Расіі

Акцёр, рэжысёр і святар Іван Ахлабысцін не будзе балатавацца ў прэзідэнты Расіі, бо гэта забаронена грамадзянам, якія маюць духоўны сан, пра што сам Ахлабысцін паведаміў у сваім Twitter'ы.

Пры гэтым Ахлабысцін запатрабаваў вярнуць графу "супраць усіх", так як цяпер "у нацыі няма выбару".

"Пакараюся меркаванню Святой Царквы", — напісаў Ахлабысцін у нядзелю.

Пра свой намер вылучацца ў прэзідэнты ён абвясціў 5 верасня, напярэдадні свайго творчага вечара ў Лужніках. Аднак рашэнне Ахлабысціна было рэзка асуджана РПЦ, дзе заявілі пра існаванне *"адназначнай забароны на вылучэнне духавенствам сваіх кандыдатур на выбарах у органы прадстаўнічай улады"*.

